Жыве Беларусь!



НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№121-122 (634-635) 24 чэрвеня 1993 г. Чацвер. Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. Тыраж 617155 экз. Кошт у розніцу — 4 руб.

ФАКС

Вкратце

В рамках программы оказания технической помощи странам СНГ и Грузии, которую осуществляет Европейское сообщество, планируется реализация проекта по Брестскому железнодорожному узлу.

По просьбе белорусской стороны в проект включены работы по созданию высокоскоростного поезда: это особенно важно для магистрали Москва—Минск—Брест—Варшава—Берлин.

❑

Первые участники Съезда белорусов мира уже приехали в Беларусь.

Это преимущественно наши соотечественники из Соединенных Штатов Америки и Канады. Среди них — Янка Запрудник, Юлия Андрусишина, Николай Ганько, Раиса Жук-Гришкевич.

❑

Минск с деловым визитом посетила делегация социал-демократической партии Швеции, которая провела две встречи с руководством и активистами БСДГ.

Стороны проинформировали друг друга о социально-политической ситуации в обеих странах и обсудили методы организационной работы.

❑

Ко дню Собора белорусских святых приурочены юбилейные торжества, посвященные 200-летию Минской епархии.

Они пройдут 25—27 июня в Минске, Заславле, Слуцке, других городах республики.

НУ ХВАТИТ ТВЕРДИТЬ О РОДОСЛОВНОЙ!!! Я ПОСЛЕДНИЙ РАЗ СПРАШИВАЮ, ЧТО КОНКРЕТНО ВЫ УМЕЕТЕ ДЕЛАТЬ ?..

ОТДЕЛ КАДРОВ

ОСТОРОЖНО! ЗЛАЯ СОБАКА!!!

РОДОСЛОВНАЯ

Рисунок Олега ПОПОВА.

Почем валюта?

С 10 июня Национальным банком Республики Беларусь установлены курсы иностранных валют

	Единый курс	Курс инвест.	К долл. США
1 австрал. доллар	1,272.05	342.50	1.4598
1 австр. шиллинг	156.22	42.06	11.8871
1 фунт стерлинг.	2,755.79	742.00	0.6739
10 бельг. франков	545.69	146.93	34.0303
1 немецк. марка	1,099.21	295.96	1.6894
1 голланд. гульден	980.30	263.95	1.8943
1 датская крона	287.31	77.36	6.4634
100 итал. лир	121.54	32.72	1,527.8921
1 канад. доллар	1,457.96	392.56	1.2737
1 норвеж. крона	260.58	70.15	7.1278
1 доллар США	1,857.00	500.00	1.0000
1 фин. марка	329.15	88.62	5.6418
1 франц. франк	327.12	88.08	5.6768
1 шведск. крона	245.94	66.22	7.5506
1 швейцар. франк	1,236.76	333.00	1.5015
10 японск. иен	166.87	44.93	111.2842
1 ЭКЮ	2,153.74	579.90	0.8622
10 испанск. песет	146.68	39.49	126.6021
10 греч. драхм	80.77	21.75	229.9121
1 ирландск. фунт	2,682.25	722.20	0.6923
1 исландск. крона	28.29	7.62	65.6416
1 кувейт. динар	6.167.99	1.660.74	0.3011
10 ливанск. фунтов	10.72	2.89	1,732.2761
10 португ. эскудо	115.79	31.18	160.3765
1 сингапур. доллар	1,136.81	306.09	1.6335
10 турецк. лир	1.74	0.47	10,672.4138
1 эстонск. крона	137.40	37.00	13.5153
1 СДР	2,574.57	693.21	0.7213
1 российский рубль	1.80		
1 укр. карбованец	0.27		
1 литовский талон	3.90		
1 латвийский рублис	13.88		
Курс клиринговых валют			
1 доллар США по расчетам с Кубой		500.00	
1 доллар США по расчетам с ЧСФР		500.00	

Такие бы деньги да года три назад!

Эта мысль невольно возникает при чтении очередного сообщения Госкомстата Беларуси.

Согласно ему, среднемесячная заработная плата рабочих и служащих в январе—мае 1993 года составила 20861 рубль и возросла по сравнению с аналогичным периодом прошлого года в 9,2 раза. В мае она достигла 28074 рублей (в апреле была 24937 рублей).

Погода и здоровье

24 июня погода в Минске и области будет формироваться под влиянием циклона.

Ожидается снижение атмосферного давления и содержания кислорода в воздухе. В таких погодных условиях повышается вероятность ухудшения самочувствия метеозависимых больных с сердечно-сосудистой патологией. В целях метеопрофилактики рекомендуется ограничение физической нагрузки, соблюдение диеты, регулярный прием препаратов, назначенных врачом. Лицам, склонным к снижению артериального давления, показан прием тонизирующих средств типа настойки лимонника, аралии, жидких экстрактов, если, конечно, нет противопоказаний к их приему.

Антонина КАРОЗА, научный сотрудник БелНИИ кардиологии.

Спорт-экспресс

Американка Джиджи Фернандес в паре с минчанкой Натальей Зверевой в финале теннисного турнира в Истборне с призовым фондом 375 тысяч долларов выиграла у дуэта Яна Новотна (Чехия) — Лариса Савченко-Нейланд (Латвия) — 2:6, 7:5, 6:1.

❑

Футболисты "Барселоны" в третий раз подряд завоевали титул сильнейшей команды Испании.

При таких ценах и умирать страшно

Подорожали услуги специального комбината Минска.

Чтобы похоронить умершего, придется заплатить примерно 31 тысячу рублей. Сюда входят стоимость гроба, катафалка, венка, ряд других услуг. Впрочем, положенных 33 тысяч рублей пособия на погребение хватит. Вам придется уплатить только за поминальный стол.

Анатолий РОМАНОВИЧ.

Выпуск подготовлен по сообщениям корреспондентов "Народной газеты", агентств ИТАР—ТАСС, Белинформ, БелаПАН и РИД.

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

Аб дадатковых мерах па сацыяльнай абароне пенсіянераў

У мэтах сацыяльнай абароны пенсіянераў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Пры пераразліку пенсій з 1 ліпеня 1993 года і карэкціроўцы заработку пры назначэнні пенсій у III квартале 1993 г. у адпаведнасці з Палажэннем аб парадку пераразліку пенсій і карэкціроўкі заработку, які вызначаецца пры назначэнні пенсій, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 7 кастрычніка 1992 г. N 606 (ЗП Рэспублікі Беларусь, 1992 г., N 28, арт. 523), прымяняць замест сярэднямесячнай заработнай платы рабочых і служачых за I квартал 1993 г. сярэднюю заработную плату рабочых і служачых за май 1993 г.

2. Да ўстанаўлення новай мінімальнай заработнай платы павысіць размер даплаты да мінімальных працоўных пенсій, прадугледжанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 16 снежня 1992 г. N 756 "Аб некаторых пытаннях пераразліку пенсій", з 25 да 40 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту.

3. Расходы, звязаныя з выкананнем гэтай пастановы, ажыццяўляюцца за кошт сродкаў пенсіённага фонду.

Першы намеснік Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М.МЯСНІКОВІЧ.

Намеснік кіраўніка спраў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В.ДЗЕБЛІКАЎ.

18 чэрвеня 1993 г.
г.Мінск. N 402

Каментарый Міністэрства сацыяльнага забеспячэння да пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 18 чэрвеня 1993 года N 402 "Аб дадатковых мерах па сацыяльнай абароне пенсіянераў"

У ліпені гэтага года пенсіі будуць вылічвацца з прымяненнем сярэднямесячнай заработнай платы рабочых і служачых за май 1993 года, якая склала 28074 руб. Для пераразліку пенсіі гэта велічыня (28074 руб.) будзе памнажацца на індывідуальны каэфіцыент заработку пенсіянера. У тых выпадках, калі атрыманы ў выніку памнажэння заработак перавысіць чатырохразовы размер мінімальнай заработнай платы, прымяняецца артыкул 56 Закона "Аб пенсіённым забеспячэнні". Згодна з гэтым артыкулам пры вылічэнні пенсіі заработак у межах чатырохразовай велічыні мінімальнай заработнай платы ўлічваецца поўнасцю, у межах пятага мінімуму — 85 працэнтаў, шостага — 70 працэнтаў, сёмага — 55 працэнтаў, восьмага — 40 працэнтаў, дзевятага — 25 працэнтаў, дзесятага — 15 працэнтаў. Заработная плата звыш дзесяціразовага размеру мінімальнай заработнай платы пры разліку пенсіі пад увагу не прымаецца.

Вылічэнне пенсіі, размер якой залежыць ад наяўнага стажу работы, робіцца з асучасненага заработку, разлічанага ва ўказаным вышэй парадку.

Размер мінімальнай заработнай платы з 1 ліпеня не мяняецца. Згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 мая 1993 года N 324 з 1 чэрвеня г.г. ён складае 6600 рублёў.

Разгледзім на прыкладзе, як будзе вылічана пенсія па ўзросту ў ліпені. Пенсіянерка В. мае агульны стаж работы 29 гадоў. Яе індывідуальны каэфіцыент заработку складае 1,26798. Заработак, які атрымаецца ў выніку асучаснівання, роўны 35597 руб. (28074 руб. x 1,26798). Паколькі гэты заработак перавышае чатырохразовую велічыню мінімальнай заработнай платы, для вылічэння пенсіі ён будзе ўлічаны ў размеры 33828 руб. : 26400 руб. — чатыры мінімумы 5610 руб. (6600 руб. — пяты мінімум x 85 працэнтаў) 1817,9 руб. (2597 руб. — заработак у межах шостага мінімуму x 70 працэнтаў). Пенсія па ўзросту ў ліпені пры стажы работы 29 гадоў складзе 21650 руб. (33828 руб. x 64 працэнты).

Да вылічанага ва ўказаным парадку размеру пенсіі налічваюцца прадугледжаныя заканадаўствам надбаўкі і павышэнні.

Пунктам 2 пастановы павялічаны размер даплаты, які выплачваецца да мінімальных размераў працоўных пенсій. У ліпені да мінімальных пенсій замест 25 будзе даплачвацца 40 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту. З улікам гэтай даплаты пенсіянерам па ўзросту, па інваліднасці 1-й і 2-й груп, з выпадку страты кармільца, за выслугу гадоў, тым, хто мае патрабуемы для назначэння пенсіі стаж работы (па ўзросту — не менш 25 і 20 гадоў адпаведна для мужчын і жанчын), размер пенсіі не можа быць менш за 9240 руб. Аднак, устаноўленыя законам надбаўкі і павышэнні (напрыклад, надбаўка на догляд, павышэнне ўдзельнікам вайны і інш.) вылічваюцца не з 9240 руб., а з мінімальнай пенсіі па ўзросту — 6600 руб.

Даплата ў размеры 40 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту будзе выплачвацца да мінімальных размераў працоўных пенсій да ўстанаўлення ў рэспубліцы новай мінімальнай заработнай платы.

Візіты

Дуглас Хог знаёміцца з Беларуссю

Першым візітам прадстаўніка Вялікабрытаніі на такім высокім узроўні ў Беларусь назваў першы намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета рэспублікі Вячаслаў Кузняцоў прыбыццё ў Мінск дзяржаўнага сакратара МЗС Вялікабрытаніі Дугласа Хога.

На непрацяглай сустрэчы, што адбылася ў Вярхоўным Савеце рэспублікі, Вячаслаў Кузняцоў адзначыў, што і эканамічнае і палітычнае супрацоўніцтва паміж абедзвюма дзяржавамі пакуль што не задавальняе беларускі бок. Два гады як Беларусь стала суверэннай дзяржавай і будуе ўласную знешнюю палітыку. Аднак за гэты час у Вялікабрытаніі адкрыта толькі генеральнае консульства рэспублікі, ды і то гэта здарылася зусім нядаўна.

В.Кузняцоў адзначыў, што ў самы бліжэйшы час яно будзе пераўтворана ў пасольства Рэспублікі Беларусь у краіне, і выказаў надзею, што адэкватныя крокі будуць зроблены і ўрадам Вялікабрытаніі.

Аляксандр ЛЮШКЕВІЧ, Белінфарм.

У Кантрольнай палаце Рэспублікі Беларусь

Будзе справа і для пракуратуры

Мікалай ГАЛКО

Пытанне, вынесенае на парадак дня, было сфармулявана як звычайна сумнавата — "Аб выніках праверкі ўзаемаразлікаў Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь з таварыствамі з абмежаванай адказнасцю "Белона" і "Юціко". Прачытаў яго і падумаў: зноў будзе безліч бухгалтарскай арыфметыкі, прозвішчаў афіцэраў... Падумаў — і памыліўся, хоць і лічбаў, і прозвішчаў сапраўды было шмат.

Даклад, зроблены намеснікам старшыні Кантрольнай палаты Васілём Даўгалёвым, закончыўся сенсацыйна. Ён прапанаваў не прымаць ніякага рашэння, а правесці расследаванне, якім чынам матэрыялы праверкі заўчасна трапілі да міністра, і праінфармаваць Вярхоўны Савет.

Справа ў тым, што работнікі Кантрольнай палаты праверку вялі па-службоваму строга канфідэнцыяльна. Аналіз фактаў вёўся, але папярэдне. Даведка аб выніках праверкі існавала, але чарнавая. Дакументы ляжалі ў сейфах, лішнія вочы іх не бачылі.

Тады чаму з'явіўся на свет Божы загад міністра абароны Паўла Казлоўскага, які грунтуецца на выніках праверкі і ў ім зроблена спасылка менавіта на Кантрольную палату. А ў сваёй ведамаснай газеце "Во славу Родины" матэрыял падаецца так, быццам бы міністэрства ў чарговы раз па ўласнай ініцыятыве закрыла яшчэ адну фінансавую дзірку.

Некаторы час Васіль Даўгалёў і яго падначаленыя былі разгублены: праз якую ж шчыліну выцягнулі інфармацыю? Свае версіі, вядома, у іх ёсць, але ў рэшце рэшт справа не ў гэтым.

У поле зроку Кантрольнай палаты трапіла таварыства з абмежаванай адказнасцю "Белона", большасць заснавальнікаў якога з'яўляюцца блізкімі сваякамі кіраўнікоў службаў Міністэрства абароны. Прывяду адзін сказ з даведкі: "Прыкрыўшыся высакароднымі мэтамі, быццам бы заробкам грошай для паляпшэння фінансавага стану Міністэрства абароны, яно (кіраўніцтва службы гаручага. — **М.Г.**) стварыла ідэальныя ўмовы для асабістага абагачэння шляхам эксплуатацыі маёмасці, якая належыць Міністэрству абароны".

Дзяржаве нанесены ўрон больш як на 51 мільён рублёў і амаль 86 тысяч долараў ЗША. Папярэдне вінаватымі з'яўляюцца намеснік міністра А.Зуеў, начальнік камерцыйнага ўпраўлення міністэрства М.Гец, начальнік фінансавага ўпраўлення А.Задайка і інш.

Але чаму на разгляд пытання нікога з ваенных не запрасілі? Паводле слоў Даўгалёва, зроблена гэта наўмысна. На яго думку, прыйшоў час спытаць з міністра абароны Казлоўскага. Тое, што ён цішком выдаў загад быццам бы ў рэчышчы высноў Кантрольнай палаты, з'яўляецца звычайным ахоўным жэстам. Па-першае, Кантрольная палата яшчэ не зрабіла канчатковых высноў, і выкарыстоўваць выкрадзеныя альбо здабытыя нейкім іншым чынам матэрыялы неэтычна і несумленна. Па-другое, пад прэс пакаранняў траляюць, як звычайна, другарадныя ваенныя чыноўнікі, а вярхушцы ў лепшым выпадку строга ўказваюць. Па-трэцяе, на думку Даўгалёва, у міністэрстве лічаць, што праверкі Кантрольнай палаты выкліканы не патрабаваннямі заканадаўства, а асабістай зацікаўленасцю аднаго з начальнікаў аддзела палаты, які ў мінулым служыў палкоўнікам у БВА.

"Хіба ж можна мірыцца з такімі падыходамі?" — спытаў у членаў савета Кантрольнай палаты Даўгалёў і прапанаваў прыцягнуць да адказнасці міністра Казлоўскага.

Рэакцыя на даклад была адпаведнай. Без эмоцый, хоць падстава для іх існавала, узважылі асноўныя факты. Большасць схілілася да таго, што адказнасць па гэтай справе павінна быць персанальнай. Намеснік старшыні палаты Мікалай Корбут настойваў аб адхіленні ад пасад некалькіх афіцэраў і генералаў, а загадчык юрыдычна-экспертнага аддзела Анатоль Хмурэц падкрэсліў, што справа мае ярка акрэслены крымінальны характар і яна абавязкова павінна быць перададзена ў пракуратуру.

Пытанне перанесена на наступнае пасяджэнне Кантрольнай палаты. Аб выніках разгляду мы праінфармуем вас, шаноўныя чытачы.

Заявление совета Белорусской конфедерации промышленников и предпринимателей

Белорусская конфедерация промышленников и предпринимателей (далее — Конфедерация) создана как координационно-совещательный республиканский орган, образованный Белорусской научно-промышленной ассоциацией, Белорусским союзом предпринимателей и арендаторов, Союзом предпринимателей Республики Беларусь (далее — участники). Она создана для защиты и воплощения в жизнь общих целей и интересов, координации деятельности, проведения переговоров с органами представительной и исполнительной власти, профсоюзами.

Основной целью Конфедерации является консолидация и координация сил членов Конфедерации по обеспечению всемерного содействия формированию и развитию цивилизованных рыночных отношений, предпринимательства, арендных отношений, защиты экономических, социальных и иных законных интересов участников, оказание правовой, организационной, информационной и иной помощи в их деятельности.

Основными задачами Конфедерации являются:

представление интересов Конфедерации в органах государственной власти и управления, общественных и общественно-политических организациях и учреждениях;

разработка предложений по совершенствованию законодательства, в том числе о предпринимательстве, об аренде, о разгосударствлении и приватизации, по развитию рыночных отношений;

изучение, обобщение и распространение опыта эффективной предпринимательской деятельности;

информационное обеспечение участников Конфедерации;

содействие развитию международных связей участников Конфедерации.

В качестве первоочередных задач Конфедерации совет определил:

вопросы налогообложения, ценообразования и стимулирования товаропроизводства всех форм собственности;

вопросы приватизации;

участие в разработке трудового законодательства;

вопросы конверсии и структурной перестройки экономики;

финансово-кредитная политика;

общественный контроль за использованием и участие в планировании средств налогоплательщиков;

выработка согласованной политики участия в следующих выборах в законодательный и представительные органы власти;

создание дополнительных рабочих мест на основе развития предпринимательства;

либерализация внешнеэкономической деятельности;

участие в определении кадровой политики при выдвижении руководителей госорганов (министерств, ведомств).

Участники Конфедерации согласно подписанному между ними соглашению приняли на себя определенные права и обязанности.

Высшим органом Конфедерации является совет, в котором представлены делегации (до 7 чел.) от всех союзов участников.

Председателем Конфедерации на первый период избран президент БНПА М.Ф.Лавринович.

Функции исполнительного органа на это же время возложены на исполнительную дирекцию БНПА (генеральный директор Н.А.Стрельцов).

Конфедерация — координационно-совещательный республиканский орган, осуществляющий свою деятельность в соответствии с Конституцией Республики Беларусь, действующим законодательством. Она открыта к конструктивному сотрудничеству со всеми заинтересованными в деле развития и ускорения рыночных реформ, достижения общественного согласия в Республике Беларусь.

Принято на заседании совета Конфедерации.

Нататкі з прэс-канферэнцыі

Як прымалі беларусаў у Швейцарыі

Яраслаў ШЫМАЎ

Не будзем падманваць самі сябе. Нашу краіну, незалежную Беларусь, пакуль што не вельмі добра ведаюць за мяжой. Еўропа і Амерыка, нават спрабуючы (або робячы выгляд, што спрабуюць) дапамагчы рэспублікам былога СССР, звяртаюць увагу ў першую чаргу на Расію. "Вялікі брат" са сваімі вялікімі бедамі часам засланяе сваіх суседзяў — новыя незалежныя дзяржавы, у тым ліку і Беларусь.

Праўда, у апошні час тое-сёе мяняецца. У прыватнасці, бела-чырвона-белы сцяг усё часцей з'яўляецца сярод сцягоў краін—удзельніц самых прэстыжных міжнародных сустрэч і нарад. Такіх, напрыклад, як прадстаўнічы агульнаеўрапейскі форум, які завяршыўся нядаўна ў Швейцарыі. У ім прымала ўдзел дэлегацыя Рэспублікі Беларусь на чале са Старшынёй Савета Міністраў Вячаславам Кебічам.

Кіраўнік урада Беларусі выступіў перад удзельнікамі форуму з дакладам аб эканамічным і палітычным становішчы краіны. Аўдыторыя, якая складалася з вядомых палітычных дзеячаў, эканамістаў, прадпрымальнікаў, выслухала прэм'ера з добразычлівай увагай. Ва ўсякім выпадку, менавіта так ахарактарызавалі адносіны ўдзельнікаў сустрэчы да даклада Кебіча і да беларускай дэлегацыі ў цэлым тыя, хто ўваходзіў у яе склад — міністр замежных спраў Беларусі Пётр Краўчанка, старшыня Дзяржкамітэта па знешнеэканамічных сувязях Уладзімір Радкевіч і старшыня праўлення Знешэканамбанка Генадзь Алейнікаў. Прыбыўшы са Швейцарыі, яны сустрэліся з журналістамі ў Нацыянальным прэс-цэнтры.

Вядома, з распасцёртымі абдымкамі нас у Еўропе ніхто не чакае. Нават усходнееўрапейскія краіны, напрыклад Чэхія і Польшча, маюць у вачах Еўрапейскага супольніцтва мноства пераваг перад нашчадкамі Саюза, які рухнуў. І тым не менш, па словах Пятра Краўчанкі, на Захадзе аддаюць належнае эвалюцыйнаму, без рэзкіх скачкоў, курсу на пераход да рынку, які праводзіць урад Беларусі. Вельмі вялікім плюсам, здольным прыцягнуць замежных інвестараў у рэспубліку, з'яўляецца і наша палітычная стабільнасць, адзначыў міністр замежных спраў. Праўда, нядаўнія мітынгі паказалі, што і ў Беларусі не ўсё так ужо ціха і добра... Між тым, калі мы страцім гэты важны козыр — спакой і стабільнасць сітуацыі, — давядзецца развітацца і з надзеямі на інвестыцыі ў беларускую эканоміку. А яны ж, у адрозненне ад невялікіх крэдытаў, што часам ідуць "у пясок", могуць вельмі дапамагчы нашай эканоміцы стаць на ногі.

Пакуль што ўстойлівая цікавасць да Беларусі ў еўрапейскіх банкіраў і бізнесменаў ёсць, лічаць Радкевіч і Алейнікаў. Візіт у Швейцарыю яшчэ раз даказаў гэта. Салідныя фірмы і банкі гатовы заключаць пагадненні аб супрацоўніцтве з беларускімі партнёрамі, а многія ўжо зрабілі гэта.

Між іншым, акрамя чыста эканамічных, існуе маса праблем, звязаных, напрыклад, з дэмілітарызацыяй Беларусі, на якую ў рэспубліцы проста няма грошай. Для своечасовага выканання праграмы па знішчэнню зброі, у першую чаргу вялікай колькасці танкаў, якія дасталіся Беларусі ад Савецкай Арміі, трэба больш як 30 мільёнаў долараў. Таму беларуская дыпламатыя і ставіць цяпер перад заходнімі партнёрамі пытанне аб выдзяленні сродкаў спецыяльна для гэтай мэты.

Туманная будучыня беларускай нацыянальнай валюты таксама не можа не хваляваць "адукаваную Еўропу". З аднаго боку, па словах Г.Алейнікава, уласная валюта — неад'емны атрыбут нармальнай самастойнай дзяржавы. З другога — уводзіць цяпер сваю грашовую адзінку Беларусь не гатова, інакш новыя грошы праз некалькі тыдняў ператворацца ў пыл. Хаця катэгарычнасць патрабаванняў Расіі, якія ўтрымліваюцца ў вядомай тэлеграме, атрыманай Нацыянальным банкам, падштурхоўвае наш урад на гэты крок. "Мы застанёмся ў рублёвай зоне да таго часу, пакуль гэта будзе магчыма", — сказаў Генадзь Алейнікаў.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Будем знакомы!

Чтобы вложить сегодня деньги в производство, нужно семь раз отмерить и всего один раз отрезать

Алесь СИВЫЙ

Тысячи молодых умов ломают сегодня голову над тем, КАК РАЗБОГАТЕТЬ. И в самом деле, как?

В расцвете перестройки они были ярыми сторонниками негласно принятого правила: "Куй железо, пока Горбачев". Малейшие денежные поступления не медля пускали в оборот, что позволило одному из них еще в студенческие годы обзавестись крохотным магазинчиком на автовокзале. Это были первые неуверенные шажки в мире бизнеса. Они не хватают с неба звезд, но и не впадают, как многие их сверстники, в пессимизм. Возможно, сегодня советы Дмитрия Кириллова и Андрея Болдырева, совладельцев собственной производственной фирмы "Белвестпром", помогут кому-то определиться в своих бизнес-исканиях и даже...

— Разбогатеть сейчас не так уж и трудно, — Дмитрий отложил план расписанных мероприятий. — Главное, чтобы человек сам проявил инициативу и выбрал, что ему по душе. А если учесть, что остановить инфляцию в ближайшее время не представляется возможным... Купля-продажа, элементарные посреднические операции — да мало ли?

Громогласно наше руководство не устает повторять, что в нынешнее время республике нужны производящие фирмы. И хотя бы один человек упомянул о тех трудностях, с какими приходится нам, производственникам, сталкиваться ежедневно! Как отвоевывали помещение под фабрику! Как кредит в банке брали! Кстати, хотим сказать огромное спасибо работникам управления Промстройбанка по Минской области за их понимание. Но есть люди, психология которых по-прежнему работает в одном направлении — кооператоры, значит, ненадежные. Никого не интересует, что ты не занимаешься куплей-продажей МАЗов, а производишь товары легкой промышленности для нашей же республики. Риск колоссальный!

Честно говоря, увиденное на фабрике меня впечатлило. Новое оборудование, чистота в швейном цеху. С уютом, правда, сложились определенные трудности, но все приходит со временем. При всем том, что предприятию в возрастном плане всего ничего, его продукция — новейшие модельные платья, другая одежда — вскоре появится на прилавках магазинов.

— Знаете, сколько на нашей фабрике получает сегодня обыкновенная швея? — спрашивает Андрей. — От 45 до 90 тысяч. Мы берем к себе на работу только профессионалов — швей, закройщиц, и требования к ним у нас очень высокие: сделал брак — заплати по полному тарифу, уворовал хотя бы одну катушку ниток — до свидания.

В рабочих руках, кстати, мы нуждаемся, ибо наше производство постоянно расширяется (контактный телефон — 72-00-54), но, повторюсь, предпочитаем иметь дело только с Мастерами.

Они начинали с малого, а уже сегодня их фирма планирует подписать контракт с известной джинсовой фирмой "Lee Cooper". Они не хватают с неба звезд, а просто работают.

Шаноўныя, не развешвайце вушэй!

У Шушкевіча сапраўды ёсць "маёнтак" на захад ад Мінска. На чатырох з паловай сотках, ля Негарэлага

Днямі стаяў у чарзе ў гастраноме, што на Старавіленскім тракце. Ведама ж, любімы занятак у чарзе — лаяць улады. І вось адна цётка гучна так пачала даводзіць: ці ж у галаве ў таго Шушкевіча нашыя беды, калі ён сабе маёнтак у Польшчы будуе!..

Не вытрымаў я, палез у спрэчку, бо пераканауспы: лухта ўсё гэта — не такі Шушкевіч чалавек! Але, мусіць, камусьці выгадна такія плёткі распускаць, наводзіць, як кажуць, цень на божы дзень. А людзі ў нас, што і казаць, да чутак ахвочыя. Тым больш што асобныя начальнікі і сапраўды даюць падставу для такіх размоў сваімі сумніцельнымі закулiснымі справамі. Глядзіш — такім чынам і на рэпутацыю сумленнага чалавека можна пляму пасадзіць...

Лічу, што гэта той выпадак, калі газета Вярхоўнага Савета проста абавязана сказаць слова ў абарону гонару лідэра дзяржавы, каб трохі прыкусілі языкі такія вось "дасведчаныя" цёткі.

Сяргей ПЕТРУШКЕВІЧ.

г.Мінск.

Не будзем удавацца ў разважанні, каму і для чаго выгадна распускаць такія вось плёткі. Адзначым толькі, што для каго-кольвечы гэта стала, відаць, ужо выпрабаваным "прыёмам" палітычнай барацьбы: успомніце, колькі лістовак з бруднымі інсінуацыямі распаўсюджвалася з мэтай дыскрэдытаваць таго ці іншага кандыдата падчас мінулай выбарчай кампаніі...

Што ж тычыцца пытання наконт "польскага маёнтка Шушкевіча", то яго задавала адна з глядачак падчас прамой лініі са Старшынёй Вярхоўнага Савета ў мінулым месяцы. Прывядзём даслоўна адказ С.С.Шушкевіча, які прагучаў тады ў тэлеэфіры (бо чулі яго, відаць, далёка не ўсе). Нам здаецца, што адказ гэты ў каментарыях не мае патрэбы:

"...Я не першы раз гавару: нідзе я нічога не будую, а ў накірунку да Польшчы, каля Негарэлага, у мяне на універсітэцкай пляцоўцы ёсць чатыры з паловай соткі зямлі. І ўжо калі нехта хоча праверыць, што не пяць — дык, калі ласка, я запрашаю. І там у мяне ёсць дамок, у якім я сябе вельмі добра адчуваю і які збудаваў пераважна сваімі рукамі, з дапамогай сяброў. Больш я нічога не будаваў, не будую і не планую будаваць. Пакуль што, ва ўсякім разе, таму што не ведаю, як знайсці сродкі на такое сур'ёзнае будаўніцтва, якое вядзецца побач з Мінскам — у Бараўлянах, калгасе імя Гастэлы і гэтак далей. Нічога такога, на жаль, я пабудаваць не магу...".

На полном серьезе

Они вернулись?

Редакции "Народной газеты".
Комитету государственной безопасности Республики Беларусь

Настоящим сообщаю, что после подавления августовского путча 1991 года, по имеющимся у меня сведениям, остатки "гэкачепистов" скопились в Полоцком и Шумилинском районах. Остается только выяснить: какими военизированными формированиями они располагают? Очевидно, готовится новый вооруженный переворот.

Вы можете спросить, откуда я получил эти сведения? Отвечаю: на дороге. Причем находясь в абсолютно трезвом состоянии и при полной ясности ума. Если сомневаетесь в правдивости информации, можете проверить. Сделать это несложно, стоит только проехать по трассе Полоцк—Витебск.

Так вот: дело было ясным солнечным днем. Я продвигался на своем личном автомобиле "Запорожец" в сторону Витебска. "Счастливого пути" пожелал мне плакат на границе Полоцкого района. Но тут меня словно током ударило. Под межевым знаком довольно внушительно, чуть ли не в граните, вырублено "Слава КПСС". Учитывая, что утром я радио не слушал, первой мыслью было: "Они вернулись". Остановил один, другой встречный автомобиль. Нет, никто ничего не слышал. Танков и бронетраспортеров на дороге не видно. Еду дальше. И тут опять руль чуть из рук не вырвался. В поселке Оболь Шумилинского района снова чуть ли не аршинными буквами на указателе этого населенного пункта "Слава ВЛКСМ". Ни того, ни другого уже, почитай, два года как нет, а тут их все еще славят, хотя всем здравомыслящим людям ясно, что они заслужили иных оценок. Происходящее ничем не могу объяснить, как делом рук "гэкачепистов". Прошу принять меры.

Иван КОРИФЕЙЦЕВ,
автомобилист-любитель.

От редакции:

Твердо веря в то, что автомобилист-любитель Иван Корифейцев находился на дороге в абсолютно трезвом состоянии и при полной ясности ума, мы позволим себе задать вопрос председателям Полоцкого и Шумилинского райисполкомов. Действительно, отчего это в их районах так славят уже давно исчезнувшие общественные организации, да еще и несуществующего государства? Неужели надеются на возвращение старых порядков?

Светская хроника

Концерт будет шикарным. С Вилли Токаревым и "Наполеоном"

Многоуважаемый Вилли Токарев, автор трепетно любимых многими эмигрантских песен, приезжает в Минск.

26 июня во Дворце молодежи (бывший Дворец пионеров на Комсомольском озере) состоится единственный концерт певца в рамках большой шоу-программы "Вилли Токарев в гостях у Хелен-Валери". Организатор шоу — фирма "Хелен-Валери" — уверена в том, что предстоящий вечер останется незабываемым. Еще бы! Билет на концерт будет стоить ни много, ни мало — 60 тысяч рублей. Правда, за эти денежки попотчуют не только песнями: на столиках будут стоять бренди "Наполеон", икорка, ветчина, бутерброды с осетровыми — словом, все непременные атрибуты ресторанов русских эмигрантов в Америке перенесутся в зал во Дворце молодежи.

Сам Вилли находится сейчас в России с серией концертов. Он любезно откликнулся на приглашение наших предпринимателей, ведь со времени его последнего приезда в Минск в конце восьмидесятых изменилось очень многое (кроме, впрочем, интереса к песням Токарева. Он по-прежнему у публики стабилен.)

Возможно, часть средств от концерта пойдет на благотворительность, однако организаторы шоу не решили еще окончательно, кого именно облагодетельствовать.

Сергей БАРАНОВ.

Добрае слова

Да яе можна зайсці ў любы час

Лічу, што дырэктарам павінен быць такі чалавек, які ўмее не толькі разумна кіраваць гаспадаркай, але і чула адносіцца да падначаленых, жыве іх радасцямі і нягодамі.

Мне здаецца, што менавіта да такіх кіраўнікоў можна аднесці Валянціну Уладзіміраўну Кротаву — дырэктара Крычаўскага маслазавода.

Мне давялося неяк пабыць у канторы завода. Звярнула на сябе ўвагу такая акалічнасць. На дзвярах кабінета В.У.Кротавай адсутнічае шыльдачка, на якой звычайна ў бюракратаў напісана чорным па белым, калі цябе могуць прыняць, а калі — не.

Валянціна Уладзіміраўна прымае наведвальнікаў у любы дзень і стараецца кожнаму дапамагчы. Яна клапоціцца аб сваіх падначаленых. Арганізоўвае завоз на тэрыторыю завода хлебабулачных вырабаў.

Не забывае В.У.Кротава і пра пенсіянераў — былых працаўнікоў завода. Імкнецца аказаць грашовую дапамогу, прадастаўляе магчымасць прыдбаць на заводзе дэфіцытныя тавары і прадукты, за што людзі ёй вельмі ўдзячны.

Але так паступаюць далёка не ўсе кіраўнікі. Возьмем, напрыклад, наш хлебазавод. Тут адных пенсіянераў лічаць сваімі, другіх — не. А каб лягчэй падзяліць на "сваіх" і "чужых", зрабілі так. Калі ты апошнія дзесяць гадоў перад пенсіяй адпрацаваў на заводзе — ты наш, калі хоць на паўгода або год меней — чужынец.

Гэтак здарылася з пенсіянерамі П.Г.Шамрыной, А.Е.Белянковым, З.П.Калтовіч і іншымі, у каго не хапіла да запаветнай рысы аднаго года альбо крыху болей. Пра іх забыліся, ім — ніякай дапамогі.

Чалавек павінен заставацца чалавекам. Тым больш камуніст, які, нягледзячы ні на што, не здрадзіў сваім ідэалам і статуту, перабраўшыся з КПСС у ПКБ. А новая партыя, як і старая, калі верыць яе лозунгам, змагаецца за шчасце кожнага грамадзяніна нашай рэспублікі. Асабліва ж павінна клапаціцца аб сацыяльнай ахове пенсіянераў, якім партыйная перабудова грамадства прынесла нямала клопатаў.

Здавалася б, тут С.Ф.Краўчанку і карты ў рукі. Змагайся, дапамагай слабым ды пакрыўджаным, чым можаш. Тым болей што маеш багаты вопыт работы ў Саветах. Але гэтага чамусьці не назіраецца. Напэўна, не так лёгка ад гучных слоў і лозунгаў перайсці да справы.

Пётр ВЕРАНІНАЎ,
ветэран вайны.

Нам стала вядома

Першы ў гісторыі...

Упершыню ў гісторыі нашай дзяржавы вядучымі вучонымі і педагогамі-практыкамі рэспублікі створаны школьны падручнік, які расказвае аб станаўленні і развіцці Беларусі.

Прэзентацыя новай кнігі па гісторыі адбудзецца 25 чэрвеня ў сценах Міністэрства інфармацыі.

Падручнік, які атрымаў назву "Гісторыя Беларусі", прызначаны для вучняў 5—6-х класаў. Аднак, як паведамілі ў Міністэрстве адукацыі, згодна з планам да пачатку новага навучальнага года на партах беларускіх школьнікаў з'явяцца яшчэ 20 новых па змесце падручнікаў. Усе яны будуць расказваць аб гісторыі і геаграфіі рэспублікі.

Кацярына ВЫСОЦКАЯ.

"Адкрыты тэлеканал" хутка адкрыецца

У адпаведнасці з рашэннем конкурснай камісіі "дабро" на арганізацыю ў Беларусі самастойнага тэлевяшчання атрымалі наступныя студыі і кампаніі: ТК ММ4, ТК "ІНТЭКС", студыя "Спектр", студыя "Сол Тэк" студыя "Прызма", студыя "Нюанс", студыя "Нірэя", МП "Дзвіна", ТК "Парытэт", студыя "Скіф", АТ МКТ, ТК "Рамас", ТК ТМК.

Апрача гэтага, ТК ММ4 атрымала ад Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі прапанову рыхтаваць на Беларускім тэлебачанні штотыднёвую праграму "Стоп-кадр".

Мінчан, відаць, хвалюе пытанне: "Калі ж зноў загарыцца экран 8-га канала?" Права на заключэнне дагавора з Міністэрствам сувязі і інфарматыкі атрымалі ўсе мінскія студыі, якія прайшлі конкурс. Так што вельмі хутка можна будзе ўбачыць іх праграмы на блакітным экране.

Што датычыцца іншых канкурсантаў, то іх праграмы змогуць рэгулярна глядзець тэлегледачы Оршы, Салігорска, Баранавічаў, Віцебска, Гомеля, Жлобіна.

Белінфарм.

Рэпарцёр даведаўся

Маэстра запрашае...

У тэатральнай зале мінскага Дома афіцэраў сёння збяруцца прыхільнікі творчасці кампазітара Ігара Лучанка.

"Мой лёс — каханне" — так называецца аўтарскі вечар прызнанага далёка за межамі рэспублікі маэстра. Больш чым за трыццацігадовы перыяд творчай дзейнасці Ігар Лучанок здолеў праявіць сябе ў самых розных музычных напрамках: вакальна-сімфанічным, камерна-інструментальным, камерна-вакальным. Але менавіта песня ўзняла яго на музычны Алімп.

У ліку ўдзельнікаў аўтарскага вечара Ігара Лучанка — студыя "Сябры", ансамблі "Мінчанка", "Званочак", камерны хор "Кантус", салісты Віктар Вуячыч, Леў Лешчанка, Юрый Рыбчынскі, Сасо Паўліяшвілі, Аляксандр Саладуха. А арганізаваць гэта песеннае свята ўзяліся беларускае таварыства "Народная дыпламатыя", творчыя саюзы, таварыства "Лімік" і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь.

Віктар КУКЛОЎ,
Белінфарм.

Возьмите на заметку!

Если ваш грузовик направляется в Литву

Согласно протоколу переговоров между делегациями Министерства сообщения Литовской Республики и Министерства транспорта и коммуникаций Республики Беларусь, с 1 июля 1993 года вводится в действие система разрешения на проезд грузового автотранспорта по территории Литвы.

Разрешения будут оформляться концерном "Белмагистральавтотранс" на пограничных переходах Мольдевичи, Бенякони, Каменный Лог, Котловка, Урбаны, Григоровщина и в Минске по ул.Серова, 4. Обязательным требованием для получения разрешений является наличие лицензионной карточки транспортного средства на право осуществления международных перевозок, выданной Министерством транспорта и коммуникаций Республики Беларусь. Плата за каждое разрешение Республики Литвы устанавливается по тарифам в СКВ. Перевозки пассажиров и грузов транспортными средствами, зарегистрированными на территориях граничащих между собой административных районов обеих сторон, между указанными районами осуществляются без разрешений. Данный порядок не распространяется на г.Вильнюс. По возникающим вопросам информацию можно получить в концерне "Белмагистральавтотранс" по телефонам в Минске: 77-19-15, 78-03-43, 78-83-47.

Бацькаўшчына

Журба за калючым дротам

Анатоль ГАТОЎЧЫЦ

Брагіншчына першай зведала жахлівае слова "радыяцыя". За ёй — адсяленне, эвакуацыя. Звыш васемнаццаці тысяч чалавек пакінулі сваё жытло. Горкі вырай. Не для птушак — для людзей. Апусцела 51 вёска, а сем, нібы салдаты, навечна пахаваны ў стылы дол.

І ўсё ж вясной, калі зноў ажывае зямля, людзей, нібы тых птушак, цягне ў родны кут, да бацькоўскіх хат.

Што сказаць ім, як суцешыць?

— Намер адзначыць сумную гадавіну акцыяй памяці "Трэба жыць", — расказвае старшыня Брагінскага райсавета, народны дэпутат Рэспублікі Беларусь Аляксандр Пракопаў, — нарадзіўся ў нашых культработнікаў. Выдзелілі з пазабюджэтнага фонду 2 мільёны рублёў — на адкрыццё бюста нашага земляка Васіля Ігнаценкі, які атрымаў смяротную дозу радыяцыі ў час пажару на атамнай станцыі, на ўстанаўленне мемарыяльных знакаў на месцах пахавання вёсак, на вечар-сустрэчу землякоў з удзелам Ігара Лучанка і Анатоля Ярмоленкі.

І ажыў Брагін. Сустрэліся людзі, з'яднаныя адной доляй, адным лёсам — чарнобыльскім. Успомнілі перажытае, адкрылі бюст, пакланіліся маці адважнага пажарнага Таццяне Ігнаценка.

Смутак і боль... І ўсё ж недзе ў душы гучыць і мажорны матыў: трэба жыць...

— Трэба! І будзем! — згаджаюцца Мікалай Гуляй і яго былы сусед, таксама калгасны кіраўнік Леў Грэсь.

Гэтыя "трэба" і "будзем" не пакідалі нас з Пятром Волкавым, намеснікам старшыні райвыканкама, і назаўтра, калі кіраваліся мы ў "зону", за калючы дрот. Была Радаўніца, і дзесяткі людзей з многіх куткоў Беларусі і Украіны ехалі да родных магіл. Даўнейшых і свежых. Ехалі хто на чым: на заказных аўтобусах і грузавіках, на ўласных легкавушках і матацыклах. Міліцэйскі КПП ледзь спраўляўся з такім наплывам. І гэта, нягледзячы на радыяцыю, раскіданыя на абшарах цэзій, стронцый і плутоній...

Клікала памяць.

Горкае відовішча — кінутыя вёскі. Але яшчэ горш бачыць людзей на могілках, густа ўсыпаных чарнобыльскай атрутай. Маркотныя твары. Жалобныя позіркі. Нязвыклая туга. Ядзерная заслона паміж людзьмі, іх вёскамі і магіламі блізкіх. Але яны ідуць сюды, адхінаючы заслону, не зважаючы на калючы дрот. Ідуць хоць раз у год — успомніць, паправіць крыж, магільны грудок. І паводле звычаю пакласці на жалобным месцы няхітры пачастунак. На тое і Радаўніца...

"Зона" ж не мае літасці. Ужо не ўбачыць сваю вёску Марыя Атрошчанка. Няма Капоранкі. Вёска ў зямлі. Ад яе толькі могілкі і засталіся, з крыжамі на стылых магілах бацькоў. Прынікнуць, прыпасці. Можа, адыдзе боль, пажвавеюць вочы?..

Няма і Чэрнева — старэйшага паселішча на беразе Брагінкі. І галосяць жанчыны: навошта закапалі?! Мала ім абеліска, бо вёска іх ведала шчасце. Жыла, кахала, радавалася веснавому сонцу. Вунь жа і напамінак — пара буслоў у гняздзе на вадакачцы.

І зноў дарога. На маршруце — Піркі. Зарослы двор, тры машыны на ўзбочыне. Ці не рабаўнікі? Вяртае да рэчаіснасці жалобны плач у здзічэлым садку. Яшчэ і сарака дзён не прайшло, як у мёртвую вёску "вярнуўся" перасяленец. У вечным чоўне — труне. У жонкі, дачок слёзы на вачах. У нас — камяк у горле.



□ Толькі помнік узбудзіць успаміны пра тых, хто тут жыў.

А потым былі Крукі. І нарэшце — Кулажын. Самотная сустрэча з перасяленцамі. Вядома, на пагосце. Яны прыехалі з Бацуні Буда-Кашалёўскага раёна.

Іван Скачок пазнае нас: пазнаёміла ў 1986-м чарнобыльская бяда.

Не бачыць, не ведаць, не чуць бы цябе, "зона"! Не заглядваюць жа сюды тыя, хто замоўчваў бяду сем гадоў назад, хто натхняў і сялян, і гараджан на ўдарную працу на стронцыевых абшарах, а сам вазіў за сабой у шыкоўных машынах і пітво, і ежу, і запасны абутак у цэлафане.

Гляджу на Пятра Волкава і разумею ўсю дарэмнасць намеру: у яго ж тут таксама дзве журбы. Вось гэты самы родны Кулажын і бацькава магіла пад векавым дубам...

Гомель—Брагін—Кулажын—Гомель.

Остановитесь!

Металлолихорадка, или О том, как в Могилеве потворствуют ворам

Николай КОМЛЕВ

В Казахстан, на остров Диксон, в Сибирь... Куда только не спешат посланцы из Могилевщины за цветными металлами, из-за отсутствия которых на грани остановки цеха и участки многих предприятий.

Но, проделав немалый путь, потратив уйму денег, не каждому удается заполучить то, что требуется.

И в то же время цветные металлы порой не килограммами, а тоннами уплывают за пределы Могилевской области. Любителей легкой наживы охватила настоящая металлолихорадка. Они дошли до того, что обрезают провода действующих телефонных линий и линий электропередач, из предприятий вывозятся даже не бывшие в употреблении узлы и детали из бронзы, меди, алюминия.

Например, со двора облпотребсоюза в поселке Буйничи Могилевского района кто-то вывез пять тонн алюминия в слитках. Из Могилевской региональной оптово-посреднической фирмы Госснаба республики бесследно исчезло 20 тонн никеля...

Только работниками милиции зафиксированы и вскрыты десятки фактов хищения цветных металлов. А сколько случаев не установлено, скрыто в трудовых коллективах!

Услышав о воровстве металлов раз, второй, заинтересовался: кто же этим занимается?

Очень часто прикладывают руку свои же родненькие работники. Причем как низшего, так и высшего ранга.

Вот типичная история о том, как 10 тонн гранулированного, с трудом добытого никеля Бобруйского машиностроительного завода оказались в руках местных воров.

Доставив ценный металл с острова Диксон до Воронежа самолетом, начальник отдела снабжения завода А.Безмен, не обеспечив груз охраной, не проконтролировав его прибытие в пункт назначения, передал никель приехавшим с завода водителям, а сам — на авиалайнер и домой.

Прибыв благополучно в Бобруйск, один из водителей, В.Гущин, вместо того, чтобы сразу отвезти ценный металл на завод, зарулил во двор родительского дома. Бросив здесь машину, причем с оставленными (словно специально!) в кабине ключами зажигания, он заспешил к жене и детям, с которыми проживает в другой части города. Видите ли, у него не закончился срок командировки, и он, наплевав на то, что на заводе с нетерпением ждут ценный металл, ушел спокойно отдыхать.

Пожалуйста, садитесь злодеи в машину и везите "валютный" никель куда угодно! Что было и сделано. Ночью ранее судимые за кражу С.Елисеев и Г.Пигульский проникли во двор стариков и угнали КамАЗ с никелем.

Отец Гущина попытался было помешать ворам, но один их них сначала припугнул его выстрелом из пистолета вверх, а затем огрел закладкой от ворот. Пока хозяин дома отходил от удара и испуга, воры укатили.

К счастью заводчан, преступников вскоре "накрыли". Но три тонны никеля воры успели загнать.

Только из-за халатности прямо на территории могилевского завода "Техноприбор" "исчезли" 700 килограммов никелевых анодов: машина с ценным грузом почти неделю стояла брошенная на произвол.

В немалой степени потворствуют воровству как руководители предприятий и организаций, так и в целом трудовые коллективы. Типичен в этом отношении случай похищения трех километров медного провода на опытно-экспериментальном заводе автоматизации и механизации. Стоило работникам милиции заняться расследованием этого факта, как в УВД облисполкома поступило прошение от администрации завода смягчить специалисту-похитителю медного провода степень наказания, поскольку он... В прошении дается специалисту такая характеристика, что иному в наградном листе стесняются подобное написать.

В результате похититель провода выходит сухим из воды.

На заводе "Строммашина" четверо рабочих под видом мусора намеревались вывезти ранее похищенные и припрятанные бронзовые детали. И вывезли бы, не помешай этой акции старший мастер М.Якушев.

Дело передали в суд. Но отделались парни, можно сказать, легким испугом. Ибо суд "удовлетворил ходатайство коллектива инструментального цеха о передаче их на исправление и перевоспитание в этом коллективе".

Бывают случаи, когда судьи не могут дать расхитителям цветных металлов на "всю катушку" из-за недостаточно глубокого исследования следственными органами фактов воровства. По этой причине, например, народный суд вынужден был отложить рассмотрение дела и вынести определение по факту покушения на хищение цветных металлов в особо крупных размерах на заводе "Могилевлифтмаш".

Пока нет четкости в работе тех, кто должен поставить заслон утечке цветных металлов как на Могилевщине, так и в целом по республике, последние продолжают уплывать. Вот и в последнем номере одной из местных газет читаю частное объявление: "Куплю: лом и отходы цветных металлов (медь, латунь, бронза)". И такие объявления из номера в номер. А это значит, что все больше и больше тощают и без того бедные запасы цветных металлов. Но, кажется, это мало кого волнует.

Могилевская область.

От редакции.

Сколько сломано копьев в дискуссиях с различных трибун, что и то у нас плохо, и с этим не ладится. Каждый раз стрелы летят то в правительство, то в парламент. Скажите, а кто мешает навести элементарный порядок в Могилевской области. Есть облисполком, есть гор- и райисполкомы, есть отделы внутренних дел, есть суды и прокуратуры, есть, наконец, руководители предприятий, организаций, колхозов и совхозов. Происходит грабеж средь бела дня, а должностные лица делают вид, что ничего не видят. Конечно, легче кричать на каждом перекрестке, чтоб тебе все подали на тарелочке. Труднее — навести порядок в своем городе, на своем заводе, в своем колхозе. Но это нужно делать, и делать решительно. И в этом плане у могилевчан огромное поле деятельности.

Мы адресуем эту публикацию прежде всего Могилевскому облисполкому и надеемся, что получим серьезное реагирование.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

ЗАМЕЖЖА

* ІТАР-ТАСС * НАРОДНАЯ ГАЗЕТА *

Пульс дня

Клінтана не падтрымліваюць

Большасць амерыканцаў не лічаць прэзідэнта краіны Біла Клінтана моцным лідэрам.

Да такога вываду прыйшоў часопіс "Ю.С. ньюс энд уорлд рыпарт" на падставе праведзенага ім апытання грамадскай думкі.

Паводле штотыднёвіка, гэта агульнанацыянальнае даследаванне паказала, што толькі 31 працэнт жыхароў Злучаных Штатаў называе цяперашняга кіраўніка Белага дома выдатным або добрым кіраўніком, а 68 працэнтаў заявілі, што могуць ацаніць яго дзейнасць толькі як здавальняючую або дрэнную.

Нешта шэпча "варожы голас"...

Роля тайных сігналаў у гульні амерыканскіх спецслужбаў была адведзена некаторым перадачам "Голасу Амерыкі" ў 80-я гады — апошняе дзесяцігоддзе "халоднай вайны", паведаміла тэлекампанія Эй-бі-сі.

Як вынікае з праведзенага ёю расследавання, урадавая радыёстанцыя Злучаных Штатаў па меншай меры пяць разоў вяла на замежжа перадачы "з падтэкстам", калі гаспадаром Белага дома быў Рональд Рэйган.

Каму ў Польшчы жыць добра

Самым багатым чалавекам у Польшчы з'яўляецца Збігнеў Нямчыцкі.

Гэты 46-гадовы прадпрымальнік узначаліў спіс ста буйнейшых капіталістаў краіны, апублікаваны папулярным часопісам "Впрост". Сёння сімвалы багацця бізнесмена, які валодае заводам тэлевізараў, гандлёвымі і будаўнічымі фірмамі, які пачаў дзейнічаць на польскім рынку дзесяць гадоў назад, добра вядомы варшавянам. Гэта, напрыклад, адміністрацыйны будынак "Курціс плаза" або збудаваны адным з яго прадпрыемстваў раён віл для багачоў на ўскраіне польскай сталіцы.

Літва пераходзіць на літы

З 25 чэрвеня ў Літве пачынаецца ўвод нацыянальнай валюты.

Адзінкай нацыянальных грошай устаноўлены літ, а яго сотай часткай — цэнт. У якасці законнага сродку разліку і аплаты ў абарачэнне выпускаюцца банкноты вартасцю 10, 20, 50 і 100 літаў, а таксама манеты у 1, 2, 5, 10, 50 цэнтаў і манеты ў 1, 2, 5 літаў. Адзін літ роўны ста адзінкам часовых грошай — талонаў.

Талоны ўсіх наміналаў пачынаюць знімацца з абарачэння з 25 чэрвеня і ў якасці сродку разліку і аплаты ў Літве з 20 ліпеня ўжо не будуць выкарыстоўвацца. Што датычыць замежнай валюты, то з 1 жніўня бягучага года ўсе разлікі ў ёй забаронены.

Московские новости

Ленин назвал "дрянью" московских большевиков

Коммунистические газеты Москвы обошли гробовым молчанием сенсационное откровение известного магистра белой практической магии Юрия Лонго, который поведал о своем общении с духом Владимира Ульянова. "Архиглупостью" назвал Ленин решение большевиков поместить его бренное тело в мавзолее, а не похоронить на кладбище.

Хлестким словом "дрянь" вождь мировой революции охарактеризовал нынешних российских продолжателей его безнадежного дела, в котором дух Ленина глубоко раскаялся.

Великий колдун заявил, что к осени в России произойдет стабилизация общественной жизни, гражданской войны не будет, а к власти придут "цивилизованные люди".

Российские таможенники активизировались

Российский таможенный комитет резко активизировал свою деятельность в связи с введением национальных валют в некоторых бывших республиках СССР. Таможенный контроль резко ужесточился на границах России с Украиной. Ведется активная подготовка контрольных постов на границах с Беларусью и Казахстаном.

Россия срочно форсирует кадровую проблему таможни. Принято постановление правительства о создании высшего учебного заведения — академии, которая уже в этом году начнет готовить таможенников-профессионалов. Срок обучения в новом вузе — пять лет. Преимуществом при поступлении пользуются военнослужащие, уволенные из армии по сокращению.

Ставка на чиновников

Жалобы москвичей на грубые нарушения правил торговли стали массовыми. Чтобы оказать хоть какое-то влияние на упорядочение стихийного бизнеса, правительство Юрия Лужкова прибегло к старому большевистскому опыту, реанимировав органы Мосторгинспекции.

Как и в старые времена, в административных районах столицы созданы территориальные управления административного контроля, число чиновников в которых увеличилось вдвое.

"Новинкой" реорганизации является то, что на стимулирование "передовиков соревнования" будет выделяться почти половина штрафов за нарушения правил торгового и бытового обслуживания. Ретивость будущих контролеров этим надежно гарантирована.

Леонид ФАДЕЕВ.

Резонанс

Права человека в Китае

15 мая с.г. в "Народной газете" была опубликована статья представителя США в Комиссии ООН по правам человека Кеннета Блэкуэлла "Долгая ночь в Китае", в которой затронут вопрос о правах человека в Китае. Посольство КНР в РБ считает, что в ней искажена истина.

В связи с этим советник посольства КНР г-н Чжу Чжаошунь знакомит читателей с состоянием прав человека в Китае. Исходя из принципа свободы слова и печати, ниже приводится его статья.

Прошло четыре года с тех пор, как на стыке весны и лета 1989 года в Пекине произошли контрреволюционные бунты, направленные на свержение народных властей, руководимых Коммунистической партией Китая. Народы всего мира уже почти успели об этом забыть. Однако некий господин из США, не уставая об этом вспоминать, упрекнул Китай в "политических репрессиях против политических диссидентов". Я уверен, что народы стран СНГ, пострадавшие от экономического спада и кровопролития в гражданских войнах, хорошо знают, как надо беречь и дорожить стабильностью своей страны. А китайский народ, именно исходя из интересов сохранения стабильности своей страны, действуя по конституции и законам Китая, усмирил контрреволюционные бунты, спровоцированные горсткой антинародных сил при подстрекательстве извне, и тем самым сохранил благоприятную обстановку для реформы и открытости перед внешним миром. За последние 14 лет среднегодовой прирост ВНП составил 9%, что считается блестящим успехом в мировой экономике.

Американский посол в своей статье не скрывает свое негативное отношение к Коммунистической партии Китая, поддержанной народом Китая. Он вовсе забыл об уважении свободы собственного выбора китайского народа, чего ни в коем случае не допускает китайский народ.

Г-н Блэкуэлл обвинил Китай еще и в репрессиях по отношению к религиозным лидерам, в частности католикам. Я принимаю это как бессмыслицу. В китайской конституции ясно и четко сказано, что граждане имеют свободу вероисповедания. Государство охраняет нормальное отправление религиозной деятельности и законные права религиозных кругов. Китайской конституцией установлено, что никому не разрешается использовать религию в целях нарушения общественного порядка, нанесения вреда здоровью граждан и причинения ущерба государственной системе образования. Религиозные общества в Китае осуществляют курс на самостоятельное, независимое управление своими делами, выступают против вмешательства в свои внутренние дела и контроля со стороны каких бы то ни было зарубежных сил в целях охраны подлинной свободы вероисповедания китайских граждан. Китайские законы устанавливают по отношению к тем, кто нарушил их, применение мер наказания, несмотря на то, верующий он или нет. Среди наказанных по закону преступников бывают и те, кто занимался деятельностью, имевшей целью свержение государственной власти, подрыв и нанесение ущерба государственной безопасности, и уголовные преступники. В числе этих преступников и верующие, но никто из них не был арестован по причине вероисповедания.

Американский автор также оказал нажим на Китай, угрожая лишением статуса наибольшего благоприятствования. Он открыто подстрекнул на повторение события на площади Тяньаньмэне.

Обладать всей совокупностью прав человека — многовековая мечта человечества. Под руководством КПК китайский народ вел мужественную борьбу, свергнув жестокое господство империализма, феодализма и компрадорского капитализма над ним, добился освобождения нации и тем самым завоевал самое основное право человека — право на существование, став как равный в стане наций мира. Правительство Китая и китайский народ прилагают неустанные усилия к защите и расширению прав человека и добились общепризнанных очевидных успехов.

У китайского народа сложились свои представления о правах человека. Они вытекают из исторических условий и конкретных реалий страны, основываются на длительном опыте. В соответствии с этими представлениями в Китае были разработаны соответствующие законы и политические установки.

Права человека в Китае имеют три явные особенности: во-первых, широкий охват населения. Права человека являются достоянием не меньшинства, не отдельных классов и прослоек, а всех граждан Китая. Китайские граждане пользуются правами в очень широком спектре. Он включает не только право на существование, право неприкосновенности личности и политические права, но и права в экономическом, социальном и других аспектах. Государство не только заботится об обеспечении прав отдельных лиц, но и уделяет внимание охране прав коллективов.

Во-вторых, справедливость. В условиях социалистического строя, установленного в КНР, пользование гражданскими правами не встречает ограничений, связанных с имущественным положением, национальной и расовой принадлежностью, полом, родом занятий, социальным происхождением, вероисповеданием, образовательным цензом, оседлостью и пр. Все граждане общества пользуются равными правами.

В-третьих, реальность. Государство через систему государственного устройства, законодательство и путем материального обеспечения гарантирует реализацию гражданских прав. Права, которыми пользуются граждане в реальной жизни, идентичны тем, что зафиксированы в Конституции и законах.

Между прочим, я хотел бы напомнить, что представляемое этим автором государство и по сей день не поставило свою подпись под Всемирной декларацией о правах человека и рядом международных документов о правах человека. В его стране наблюдаются также неблаговидные рекорды в области прав человека. Я думаю, что потрясший весь мир инцидент в Лос-Анджелесе, вызванный дискриминацией по отношению к негритянскому населению, дискриминация женщин, массовая безработица и т.д. — вот вопросы, которым этому уважаемому представителю следует уделять приоритетное внимание. Позвольте спросить: разве в США черная и белая расы пользуются одинаковыми политическими правами? Куда девались американские индейцы? Не правда ли, что их уничтожили физически? Кстати, добавлю несколько слов. В Тибете, о котором упомянуто в этой статье, с 13-го века по 50-е годы 20-го века количество населения длительное время колебалось в пределах 1 250 000 человек, а теперь, за 40 лет после мирного освобождения, тибетское население удвоилось. Мы не можем согласиться с применением двояких стандартов в вопросе о правах человека.

Новости из Германии

Поток иммигрантов в Германию пошел на убыль

За пять месяцев нынешнего года на свою историческую родину вернулись 71822 немца, подавляющее большинство из них — из бывшего Советского Союза.

По сравнению с соответствующим периодом прошлого года это на 5 тысяч меньше. На 31 процент сократилось и количество тех, кто подал заявление о выезде. По мнению уполномоченного федерального правительства по вопросам переселенцев, парламентского статс-секретаря при федеральном министре внутренних дел Херста Ваффеншмидта, эта тенденция свидетельствует о том, что многие из 4 миллионов немцев, проживающих в настоящее время в Восточной Европе, намерены не гоняться за призрачным счастьем, а обустраивать свою жизнь дома.

Любопытно, что уменьшается и количество нелегальных иммигрантов. В мае их было 2205, 2100 из них без всякого разбирательства отправлены обратно, 40 подали прошение о предоставлении им убежища. Впрочем, шансов на положительное решение у них нет практически никаких. Как известно, недавно бундестаг принял новую, более жесткую редакцию статьи 16 конституции ФРГ, регулирующую отношение к иммигрантам.

С 1954 по 1993 годы в Германию переселилось из СССР около 782 тысяч немцев.

Мы не рабы, но стать ими не против

1400 берлинских фирм, прежде всего строительных, уличены в использовании нелегальной рабочей силы.

Большинство из добровольных "рабов" — эмигранты из СНГ и других восточноевропейских стран. За свой тяжелый, как правило, ручной труд они получают жалкие гроши. Но готовы к любым лишениям и унижениям, поскольку по сравнению с теми "деревянными", что они могли бы зарабатывать у себя на родине, это настоящее богатство. Наиболее предприимчивым и удачливым удается пристроиться и к государственной "кормушке" — получать пособие по безработице. В 1992 году выявлена незаконная выплата из этого фонда 11,3 миллиона марок.

"...И тебя за то, что ты дал мне закурить"

700 тысяч пачек сигарет, общей стоимостью в 3,5 миллиона марок, конфисковала с начала нынешнего года берлинская полиция у спекулянтов.

Большинство из них — вьетнамцы. Еще совсем недавно их можно было встретить буквально на каждом углу. Органы внутренних дел объявили нелегальным торговцам беспощадную войну. Особенно успешно проходят рейды переодетых в гражданское полицейских.

Игорь ОСИНСКИЙ,
соб. корр.
"Народной газеты" в ФРГ.

Футбол

Кубок — в Гродно!

Алесь СИВЫЙ,
Сергей БРУШКО (фото)

Едва закончился национальный футбольный чемпионат, как в болельщицкой среде разгорелись новые страсти. Страсти по финалу Кубка Беларуси.

Команды-финалисты — и гродненский "Неман", и речицкий "Ведрич" — еще в полуфинальных матчах, победив соответственно минское "Динамо" и витебский "КИМ", устроили в футбольных кругах настоящий переполох. Еще бы! Решался вопрос, кому осенью этого года представлять республику в Кубке обладателей кубков, а про такое окошко в Европу, как известно, мечтает каждый. "Ведрич", совсем было сникший в национальном чемпионате (15-е место в итоговой турнирной таблице), пошел ва-банк против гродненских футболистов, а его главный тренер Геннадий Абрамович заявил накануне встречи, что настроение у команды оптимистичное и она полна решимости бороться за Кубок. Футбольные специалисты были несколько иного мнения относительно результата предстоящей игры, дружно зачисляя баллы на счет гродненчан. Посылки делались самые разные, но все сводилось к тому, что реально "Неман" сегодня сильнее.

Так оно и оказалось. Нет необходимости пересказывать сюжет встречи, достаточно упомянуть, что после многих сонных и неуклюжих матчей первенства это зрелище было, как бальзам на душу болельщикам. Счет же — 2:1 в пользу "Немана" — лишний раз отражает накал настоящего боя.

И еще. Минский стадион давненько уже не видел такого наплыва болельщиков. Ладные десять тысяч любителей футбола, преимущественно из числа гродненских и речицких фанов, нагрянули в этот день на "Динамо". После матча восторженные гродненские фанаты, не обращая внимания на сопровождавший их омоновский эскорт, долго пели в адрес победителей хвалебные песни. И пусть завидуют их минские "коллеги"! А итальянской "Парме", нынешнему обладателю Кубка кубков, посоветовали бы — берегитесь!

❑ *Момент финальной игры и радостное ликование болельщиков и футболистов гродненского "Немана".*

СВЕТ В ОКНЕ

ВЫПУСК 12 (58)

Женская психология

Как я стала красивой...

Вера БОГУ

Мне было двадцать лет.

Я была незаметная.

И взялись за меня женщины, которые постарше. Видные, интересные, яркие.

— Ты сама виновата, что за тобой кучи поклонников нет, — говорила одна.

— Что у тебя за прическа! Не прическа, а плакучая ива! — причитала вторая.

— Какие глаза, если присмотришься! Но кому это надо — присматриваться! — возмущалась третья.

— С твоих рук можно слепки делать, а у тебя они вечно в чернилах! — морщилась четвертая.

— Другой бы такие ножки! — закатывала глазки пятая...

Я была молодая. Была очень скромная. Но не была глупая.

Я уложила свои волосы, золотые россыпи, в ультрамодную прическу.

Вычертила свои глаза миндалинами.

Поставила на каблук свои ноги.

Обтянула талию широким ремнем.

Мои пальцы побывали в руках маникюрши.

Я стала красивой.

Я стала заметной.

За мной бегало стадо поклонников.

Женщины вокруг меня повели много разговоров...

— Что хорошего в ее руках! Только и всего, что полуметровые накрашенные ногти! — говорила одна. — А так — грабли!

— Какая там талия! Затянулась, несчастная, в три погибели! — замечала другая.

— Да у нее же без каблука явно кривые ноги! — возмущалась третья.

— Конечно! Совершенно ничего особенного в ней нет, так себе смазливенькая! — снисходила четвертая.

— Да какая там смазливенькая! Она же просто страшненькая, если присмотришься! — делала вывод пятая.

Но разговоры эти уже не имели никакого значения.

Мне было двадцать лет.

Я была красивая...

Імгненне і вечнасць



Мой родны кут...
Фота Аляксандра БЕРАЗНЯКА.

Зеленая лампа

Если мы не увидимся никогда...

Алексей ЛОМТЕВ

Жизнь, между прочим,
не кончается
При первой крупной
неудаче.
Лишь замирает,
возвращается,
Быть может, чуточку
иначе.
И познается все поздней,
Хоть обостреннее
вначале,
Хоть с каждым годом
холодней
И меньше слов и
обещаний.
Хоть с каждым годом
больше зла,
Неискренности и печали...
Так мы с тобой сожгли
до тла
То, что друг другу
обещали.

* * *

Даже если мы уже
не увидимся никогда,
И какие-то линии
разрежут надвое города,
И в одной части города
окажешься ты,
а в другой — я,
Все равно мне уже
не забыть тебя.

Малюнак Алега ПАПОВА.

Имена и характеры

Вячеслав

Добрые, обаятельные, темпераментные.

Вспылят, но тут же извинятся, если обидели — приласкают.

Если что-то не выходит — раздражаются, но дело доводят до конца, им свойственна добросовестность.

Зимние — упрямые, настырные, крепче летних.

К людям относятся ровно, крайне редко вступают в конфликты.

С удовольствием принимают гостей, не отказываются выпить.

Надежные мужья, хорошие отцы.

Елизавета СОЛДАТОВА.

(По материалам брошюры "Характер человека зависит от имени". — Санкт-Петербург, 1991 г. и книги "Личный магнетизм". — Москва, 1990 г.).

Из записной книжки

Всякая всячина

Современная любовь

Любовник жены — спонсор, любовница мужа — альтернатива.

Объявление в ЖКХ

Граждане! Берегите тепло. Не разводитесь.

Вечный зов

Товар ищи!

Собрал Станислав АСТАШЕВИЧ.

Раздел ведет Юрий Секунда.

Народная газета

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб унутраным дзяржаўным доўгу Рэспублікі Беларусь

Гэты Закон вызначае парадак утварэння, абслугоўвання ўнутранага дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь і кіравання ім.

Мэтай гэтага Закона з'яўляецца стварэнне прававой базы для аперацый, якія праводзяцца ў адносінах да ўнутранага дзяржаўнага доўгу.

Артыкул 1. Вызначэнне ўнутранага дзяржаўнага доўгу

Пад унутраным дзяржаўным доўгам разумеецца выражаная ў форме дзяржаўных даўгавых абавязацельстваў запазычанасць Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь перад юрыдычнымі і фізічнымі асобамі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 2. Гарантыі па ўнутранаму дзяржаўнаму доўгу

Гарантыямі па ўнутранаму дзяржаўнаму доўгу Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца маёмасць і іншыя актывы, якія знаходзяцца ў рэспубліканскай уласнасці.

Артыкул 3. Ліміт унутранага дзяржаўнага доўгу

Гранічны штогадовы прырост або скарачэнне ўнутранага дзяржаўнага доўгу ўстанаўліваецца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь па прапановах Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 4. Формы ўнутранага дзяржаўнага доўгу (дзяржаўных даўгавых абавязацельстваў) і права запазычання

Унутраны дзяржаўны доўг можа быць прадстаўлены ў выглядзе пазык, якія выпускаюцца ў форме каштоўных папер ад асобы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, крэдытаў Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, іншых даўгавых абавязацельстваў, гарантаваных Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Дзяржаўныя даўгавыя абавязацельствы могуць быць каароткатэрміновымі і доўгатэрміновымі.

Умовы выпуску і абарачэння дзяржаўных даўгавых абавязацельстваў рэгулююцца пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Права прыцягнення пазыковых сродкаў у юрыдычных і фізічных асоб ад асобы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь належыць толькі Міністэрству фінансаў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 5. Кіраванне ўнутраным дзяржаўным доўгам

Пад кіраваннем унутраным дзяржаўным доўгам разумеецца вызначэнне ўмоў выпуску, размяшчэння, абарачэння і абслугоўвання дзяржаўных даўгавых абавязацельстваў.

Кіраванне ўнутраным дзяржаўным доўгам ажыццяўляецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь або па яго рашэнню Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 6. Абслугоўванне ўнутранага дзяржаўнага доўгу

Пад абслугоўваннем унутранага дзяржаўнага доўгу разумеецца выплата працэнтаў па дзяржаўных даўгавых абавязацельствах і іх пагашэнне шляхам выкупу або іншага выключэння з абарачэння.

Абслугоўванне ўнутранага дзяржаўнага доўгу ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту або іншых актываў, якія знаходзяцца ў рэспубліканскай уласнасці.

Аперацыі па абслугоўванню ўнутранага дзяржаўнага доўгу ажыццяўляюцца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь і іх органамі на месцах або па даручэнню і пад кантролем Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь камерцыйнымі банкамі.

Парадак і тэрміны пагашэння ўнутранага дзяржаўнага доўгу вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь або па яго рашэнню Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 7. Даўгі мясцовых органаў улады

Даўгі мясцовых органаў улады не ўваходзяць у склад унутранага дзяржаўнага доўгу Рэспублікі Беларусь, а парадак кіравання імі і іх абслугоўвання рэгулюецца рашэннямі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў.

Гранічны штогадовы прырост або скарачэнне даўгоў мясцовых органаў улады ўстанаўліваецца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь па прапановах Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 8. Улік унутранага дзяржаўнага доўгу і даўгоў мясцовых органаў улады

Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь або па яго рашэнню Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь вядзецца рэестр унутранага дзяржаўнага доўгу, а таксама рэестр даўгоў мясцовых органаў улады.

Мясцовыя органы ўлады прадстаўляюць неабходныя звесткі для вядзення рэестра даўгоў мясцовых органаў улады.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С.ШУШКЕВІЧ.

27 мая 1993 г.
г.Мінск.
N 2328-XII

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь "Аб унутраным дзяржаўным доўгу Рэспублікі Беларусь"

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Увесці ў дзеянне Закон Рэспублікі Беларусь "Аб унутраным дзяржаўным доўгу Рэспублікі Беларусь" з дня апублікавання, а артыкул 7 — з 1 лютага 1994 года.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С.ШУШКЕВІЧ.

27 мая 1993 г.
г. Мінск. N 2329-XII

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб прызнанні страціўшымі сілу некаторых заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь у сувязі з прыняццем Закона Рэспублікі Беларусь "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях"

У сувязі з прыняццем Закона Рэспублікі Беларусь "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях" Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Прызнаць страціўшымі сілу:

пастанову ЦВК Рэспублікі Беларусь ад 18 снежня 1926 года "Аб адмене цыркуляра Прэзідыума Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР ад 26 верасня 1924 года аб прадастаўленні правоў грамадзянства служыцелям рэлігійных культаў, якія адмовіліся ад сану" /33 БССР, 1927 г., N 1, арт. 8/;

пункт 1 раздзела 1 пастановы ЦВК і СНК Рэспублікі Беларусь ад 22 снежня 1928 года "Пра пашырэнне на тэрыторыю далучанай да БССР Гомельшчыны некаторых законаў, зацверджаных урадам БССР" /33 БССР, 1929 г., N 2, арт. 4/.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С.ШУШКЕВІЧ.

11 чэрвеня 1993 г.
г.Мінск.
N 2377-XII

ПАЛАЖЭННЕ аб рэспубліканскіх прэміях Саюза журналістаў Беларусі за лепшыя журналісцкія работы 1992 года

У мэтах заахвочвання творчай дзейнасці журналістаў, павышэння іх прафесійнага майстэрства Саюз журналістаў Беларусі зацвердзіў 7 прэмій (грашовых або рэчавых) за лепшыя работы 1992 года.

У конкурсе могуць прыняць удзел журналісты рэспубліканскіх, абласных, гарадскіх, раённых, шматтыражных газет, часопісаў, радыёвяшчання, тэлебачання, інфармацыйных агенцтваў, выдавецтваў.

На конкурс прадстаўляюцца работы любых жанраў, якія вызначаюцца высокім прафесійным узроўнем, што атрымалі шырокае прызнанне і грамадскі рэзананс, апублікаваныя ў друку або прайшоўшыя ў эфіры на працягу 1992 года (са студзеня па 31 снежня).

Тэрмін падачы работ — да 1 жніўня 1993 года. Работы прадстаўляюцца на конкурс у трох экземплярах. Аўтар паведамляе пра сябе кароткія звесткі: год нараджэння, стаж работы ў журналістыцы, адукацыя, рабочы і дамашні адрасы, тэлефоны.

Работы на конкурс могуць быць прадстаўлены як абласнымі, гарадскімі, пярвічнымі арганізацыямі, так і самімі аўтарамі работ.

Дакументы накіроўваюцца ў Саюз журналістаў Беларусі на адрас: 220005, г.Мінск, вул. Пятра Румянцава, 3.

Матэрыялы разглядае пастаянна дзеючы Камітэт па рэспубліканскіх прэміях СЖБ. Прэміі прысуджаюцца на пашыраным пасяджэнні выканкама СЖБ (копіі пратакола высылаюцца ў мясцовыя журналісцкія арганізацыі).

Лаўрэату рэспубліканскай прэміі Саюза журналістаў Беларусі разам з прэміяй уручаецца дыплом.

СЖБ — БелаПАН.

Ад Камітэта па дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі

Камітэт па дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі прымае работы на атрыманне дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 1994 года.

Згодна з палажэннем аб Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі, прэміі прысуджаюцца за:

— навуковыя даследаванні, якія ўносяць буйны ўклад у развіццё прыродазнаўчых, гуманітарных і тэхнічных навук і садзейнічаюць паскарэнню эканамічнага і сацыяльнага развіцця рэспублікі, вырашэнню агульначалавечых задач, выхаду беларускай навукі і тэхнікі на ўзровень сусветных дасягненняў;

— распрацоўку і ўкараненне новых відаў тэхнікі, матэрыялаў і тэхналогій, якія адпавядаюць па сваіх паказчыках лепшым сусветным аналагам, забяспечваюць павышэнне тэмпаў развіцця і эфектыўнасці эканомікі, а таксама за стварэнне рэсурсазберагаючых і экалагічна чыстых тэхналогій;

— падручнікі для вышэйшых, сярэдніх спецыяльных і прафесіянальна-тэхнічных устаноў, сярэдніх агульнаадукацыйных школ, якія адрозніваюцца высокімі навукова-метадычнымі вартасцямі і атрымалі шырокае грамадскае прызнанне.

Навуковыя працы і падручнікі, якія вылучаюцца на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі, павінны быць апублікаваны не менш чым за год да прадстаўлення іх на прэмію, а новыя віды тэхнікі, матэрыялаў і тэхналогій — асвоены ў народнай гаспадарцы.

Дзяржаўныя прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі прысуджаюцца адзін раз у два гады (кожны цотны год) у наступнай колькасці: у галіне прыродазнаўчых навук — тры прэміі, у галіне гуманітарных навук — адна, у галіне тэхнікі — дзве, за падручнікі — адна прэмія.

Размер прэміі ўстанаўліваецца пры прыняцці рашэння аб яе прысуджэнні Прэзідыумам Вярхоўнага Савета і Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Вылучэнне работ на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі праводзіцца прэзідыумам Акадэміі навук Беларусі, калегіямі міністэрстваў і ведамстваў, навукова-тэхнічнымі і вучонымі саветамі аб'яднанняў, прадпрыемстваў, навуковых і вышэйшых навучальных устаноў.

Рашэнне аб вылучэнні работы прымаецца адкрытым галасаваннем, а аб вылучэнні кандыдатаў у саіскальнікі — тайным галасаваннем пры наяўнасці кворуму, прынятага ў арганізацыі, дзе праводзіцца галасаванне. Пры прадстаўленні навуковых прац у склад калектыву, які вылучаецца, могуць уваходзіць толькі асобы, якія з'яўляюцца аўтарамі дадзеных прац. Галасаванне кандыдатур у саіскальнікі праводзіцца па месцы іх працы або ў арганізацыі, якая іх вылучае.

Не дапускаецца вылучэнне на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі работы, удастоенай (або вылучанай на атрыманне) прэміі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, а таксама міжнароднай прэміі або прэміі іншай дзяржавы.

Калектыў саіскальнікаў, які вылучаецца на Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі, не можа перавышаць 6 чалавек.

Не дапускаецца ўключэнне ў калектыў саіскальнікаў асоб:

— толькі па прыкметах адміністрацыйнага, кансультацыйнага і арганізацыйнага дачынення да работы;

— раней удастоеных за гэту работу дзяржаўнай узнагароды;

— уваходзячых у аўтарскі калектыў работы, вылучанай на атрыманне прэміі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, міжнароднай прэміі або прэміі іншай дзяржавы.

Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь, як правіла, паўторна не прысуджаецца. У асобных выпадках лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь гэта прэмія можа быць прысуджана паўторна толькі пры ўмове новых выдатных дасягненняў, але прадстаўленне да наступнага прысуджэння можа рабіцца не раней, чым праз 7 гадоў пасля папярэдняга прысуджэння.

У склад калектыву саіскальнікаў могуць быць уключаны асобы, якія не з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, але выконвалі работу па сумесных з арганізацыямі рэспублікі планах і праграмах і вылучаны гэтымі арганізацыямі.

Работы, якія вылучаюцца на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі, прымаюцца да разгляду Камітэтам па дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі да 1 лютага 1994 года і разглядаюцца ў два этапы. На першым этапе адбіраюцца работы для ўдзелу ў конкурсе на атрыманне прэміі, на другім — прымаецца рашэнне аб прысуджэнні прэміі найбольш дастойным работам і аўтарскім калектывам.

Па ўсіх пытаннях, звязаных з вылучэннем і афармленнем работ, звяртацца ў Камітэт па дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі на адрас: 220072, г.Мінск, праспект Скарыны, 66, пакой 317. Тэлефоны: 39-54-56, 39-31-11.

Верховному Совету Республики Беларусь, Совету Министров Республики Беларусь

Повернитесь лицом к Новополоцку

В мае 1991 года сессия Новополоцкого городского Совета народных депутатов поддержала предложение производственного объединения "Нафтан" о строительстве комплекса углубленной переработки нефти на производственной площадке объединения.

Принимая такое решение, народные депутаты руководствовались прежде всего необходимостью повышения конкурентоспособности выпускаемой продукции на мировом рынке, уменьшения количества потребляемого нефтяного сырья.

Прошло два года. ПО "Нафтан" заключило контракт с зарубежными фирмами на строительство комплекса. Казалось бы, дело должно было сдвинуться. Однако, как следует из сообщения средств массовой информации, позиция заинтересованных ведомств, практически поставила под сомнение реализацию указанного проекта.

Новополоцкий регион является одним из важнейших в обеспечении работы народного хозяйства республики. Тем не менее первые лица нашего государства предпочитают обходить его стороной. За последние 3 года с кратким посещением города в Новополоцке побывал лишь Председатель Верховного Совета.

Такое невнимание к Новополоцку и его промышленному потенциалу передается и руководителям министерств, ведомств и комитетов исполнительной власти.

В результате из года в год неуклонно снижаются нормативы отчислений в местный бюджет, налагаются ограничения на использование потенциала предприятий в решении городских проблем, под предлогом того, что в городе расположены крупные предприятия, практически сведена к минимуму централизованная поддержка местных программ.

Осознавая свою ответственность перед населением г.Новополоцка, Новополоцкий городской Совет народных депутатов решил:

1. Предложить Совету Министров Республики Беларусь и Верховному Совету Республики Беларусь безотлагательно рассмотреть вопрос о комплексном развитии новополоцкого промышленного узла и социальной сферы г.Новополоцка.

2. Пригласить Председателя Совета Министров посетить гор. Новополоцк для изучения обстановки на месте в июне—августе 1993 года.

Принято XII сессией Новополоцкого городского Совета народных депутатов (9 июня 1993 года).

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб бюджэтнай сістэме Рэспублікі Беларусь

РАЗДЗЕЛ І. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. Бюджэт

Бюджэт — асноўны фінансавы план фарміравання і расходавання грашовых сродкаў для забеспячэння функцый органаў дзяржаўнай улады.

Артыкул 2. Бюджэтная сістэма

Бюджэтная сістэма ўяўляе сабой заснаваную на эканамічных адносінах і нормах заканадаўства сукупнасць рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў.

Артыкул 3. Бюджэтнае ўпарадкаванне

Бюджэтнае ўпарадкаванне ўяўляе сабой арганізацыю бюджэтнай сістэмы і прынцыпы яе пабудовы. Бюджэтнае ўпарадкаванне ў Рэспубліцы Беларусь засноўваецца на прынцыпах адзінства, паўнаты, рэальнасці, галоснасці і самастойнасці ўсіх бюджэтаў, якія ўваходзяць у бюджэтную сістэму Рэспублікі Беларусь, і вызначаецца адміністрацыйна-тэрытарыяльнай будовай Рэспублікі Беларусь як суверэннай дзяржавы.

Артыкул 4. Бюджэтны працэс

1. Бюджэтны працэс — рэгламентаваная законам і іншымі нарматыўнымі актамі дзейнасць органаў дзяржаўнай улады і дзяржаўнага кіравання па складанню, разгляду, зацвярджэнню і выкананню бюджэту. Складаной часткай бюджэтнага працэсу з'яўляецца бюджэтнае рэгуляванне, якое ўяўляе сабой частковае пераразмеркаванне фінансавых рэсурсаў паміж бюджэтамі розных узроўняў у мэтах збалансавання іх даходаў і расходаў.

2. Бюджэтны працэс у Рэспубліцы Беларусь будуецца ў адпаведнасці з гэтым Законам, іншымі актамі заканадаўства, якія рэгулююць бюджэтны працэс, а таксама рашэннямі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў, прынятымі ў межах іх кампетэнцыі.

3. Складанне бюджэту праводзіцца на аснове прагнозных ацэнак паступленняў даходаў і зыходзячы з патрэбнасцей у бюджэтных асігнаваннях на фінансаванне мерапрыемстваў па эканамічнаму і сацыяльнаму развіццю тэрыторый у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам і зацверджанымі дзяржаўнымі і рэгіянальнымі праграмамі.

4. Рэспубліканскі бюджэт Рэспублікі Беларусь зацвярджаецца законам Рэспублікі Беларусь, мясцовыя бюджэты — рашэннямі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў.

5. Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь і мясцовымі фінансавымі органамі штогод складаюцца зводы зацверджаных бюджэтаў на адпаведнай тэрыторыі.

6. Фінансавы (бюджэтны) год на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь устанаўліваецца ў 12 месяцаў — з 1 студзеня па 31 снежня каляндарнага года.

Падліковы перыяд уключае фінансавы год і льготны перыяд пасля яго завяршэння, што складае адзін месяц, на працягу якога завяршаюцца аперацыі па абавязацельствах, прынятых у рамках выканання бюджэту.

7. Правілы складання і выканання рэспубліканскага бюджэту ўстанаўліваюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь або па яго даручэнню Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь, мясцовых бюджэтаў — абласнымі (Мінскім гарадскім) Саветамі народных дэпутатаў.

Артыкул 5. Бюджэтна-фінансавая палітыка

Бюджэтна-фінансавая палітыка Рэспублікі Беларусь, якая ўключае падатковую палітыку, праводзіцца ўзгоднена з грашова-крэдытнай, цэнавай і валютнай палітыкай Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 6. Узаемаадносіны з іншымі дзяржавамі ў галіне бюджэтна-фінансавай палітыкі

1. Рэспубліка Беларусь можа прымаць на сябе абавязацельствы па ўзгадненню бюджэтна-фінансавай палітыкі з іншымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі ў адпаведнасці з заключанымі міждзяржаўнымі пагадненнямі і міжнароднымі дагаворамі.

2. Рэспубліка Беларусь можа ва ўласных інтарэсах выдзяляць іншым дзяржавам фінансавыя сродкі ў выглядзе фіксаваных сум, што зацвярджаюцца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь, а таксама атрымліваць ад іншых дзяржаў мэтавыя фінансавыя сродкі.

РАЗДЗЕЛ ІІ. АСНОВЫ БЮДЖЭТНАГА ЎПАРАДКАВАННЯ

Артыкул 7. Структура бюджэтнай сістэмы

У бюджэтную сістэму Рэспублікі Беларусь як самастойныя часткі ўключаюцца рэспубліканскі бюджэт Рэспублікі Беларусь, абласныя, раённыя, гарадскія, раённыя ў гарадах, пасялковыя бюджэты і бюджэты сельсаветаў.

Артыкул 8. Адзінства бюджэтнай сістэмы

1. Адзінства бюджэтнай сістэмы забяспечваецца адзінай заканадаўчай базай, адзінай формай бюджэтнай дакументацыі, выкарыстаннем адзінай бюджэтнай класіфікацыі, прадастаўленнем неабходнай статыстычнай і бюджэтнай інфармацыі з ніжняга ўзроўню на наступны ўзровень бюджэтаў для складання зводу бюджэтаў Рэспублікі Беларусь, узгодненымі прынцыпамі бюджэтнага працэсу, адзінствам грашовай сістэмы.

2. Адзінства бюджэтнай сістэмы заснавана на ўзаемадзеянні бюджэтаў усіх узроўняў, якое ажыццяўляецца праз выкарыстанне рэгулюючых даходных крыніц, стварэнне мэтавых і рэгіянальных бюджэтных фондаў, іх частковае пераразмеркаванне.

Артыкул 9. Самастойнасць бюджэтаў

Рэспубліканскі бюджэт і мясцовыя бюджэты ўсіх узроўняў з'яўляюцца самастойнымі і адлюстроўваюць даходы і расходы, якімі распараджаецца адпаведны орган улады. Самастойнасць бюджэтаў забяспечваецца наяўнасцю ўласных крыніц даходаў і правам вызначаць напрамкі іх выкарыстання.

Да ўласных крыніц даходаў бюджэтаў адносяцца:

замацаваныя законам крыніцы даходаў для бюджэту кожнага ўзроўню;

адлічэнні па рэгулюючых крыніцах даходаў;

дадатковыя крыніцы даходаў, якія ўстанаўліваюцца самастойна мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь

Артыкул 10. Даходы бюджэтаў

1. Даходы бюджэтаў кожнага ўзроўню фарміруюцца ў адпаведнасці з падатковым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і артыкулам 9 гэтага Закона.

2. Устанаўленне агульнарэспубліканскіх падаткаў, збораў і непадатковых плацяжоў, якія збіраюцца на ўсёй тэрыторыі рэспублікі, знаходзіцца ў веданні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

3. Мясцовыя Саветы народных дэпутатаў маюць права ўстанаўліваць мясцовыя падаткі, зборы і непадатковыя плацяжы, якія залічваюцца ў іх бюджэты, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 11. Расходы бюджэтаў

Расходы бюджэтаў кожнага ўзроўню вызначаюцца функцыямі адпаведнага органа ўлады і задачамі сацыяльна-эканамічнага развіцця тэрыторыі.

У расходы бюджэтаў уключаюцца асігнаванні на фінансаванне інвестыцыйнай і інавацыйнай дзейнасці і іншыя затраты, звязаныя з расшыраным узнаўленнем, на бягучае ўтрыманне ўстаноў народнай адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнага забеспячэння, культуры, навукі, органаў дзяржаўнай улады і кіравання, судоў, праваахоўных органаў, органаў пракуратуры, дзяржаўнай бяспекі, абароны, пагранічных войск, мытнай службы і іншыя расходы.

Артыкул 12. Абаротная касавая наяўнасць

У рэспубліканскім бюджэце і мясцовых бюджэтах усіх узроўняў звыш прадугледжаных расходаў утвараецца абаротная касавая наяўнасць. Павелічэнне абаротнай касавай наяўнасці праводзіцца за кошт рэшткаў сродкаў па адпаведных бюджэтах на пачатак плануемага года і даходаў бюджэту бягучага года.

Абаротная касавая наяўнасць на працягу года выкарыстоўваецца на пакрыццё часовых касавых разрываў і павінна быць адноўлена да канца года ў размерах, устаноўленых пры зацвярджэнні бюджэту.

Артыкул 13. Бюджэтная класіфікацыя

Бюджэтная класіфікацыя ўяўляе сабой абавязковую адзіную групоўку даходаў і расходаў, заснаваную на іх эканамічнай характарыстыцы.

У Рэспубліцы Беларусь выкарыстоўваецца адзіная бюджэтная класіфікацыя, якая забяспечвае супастаўнасць даных бюджэтаў усіх узроўняў.

Бюджэтная класіфікацыя распрацоўваецца і зацвярджаецца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 14. Збалансаванасць бюджэту

1. Збалансаванасць бюджэтаў усіх узроўняў з'яўляецца неабходнай умовай бюджэтна-фінансавай палітыкі.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, выканаўчыя камітэты мясцовых Саветаў народных дэпутатаў абавязаны прымаць меры па забеспячэнню збалансаванасці адпаведных бюджэтаў.

2. Перавышэнне расходаў над даходамі складае дэфіцыт бюджэту.

Пры наяўнасці дэфіцыту бюджэту першачарговаму фінансаванню падлягаюць расходы на бягучае ўтрыманне ўстаноў сацыяльнай сферы і сацыяльную абарону насельніцтва.

Рэспубліканскі і мясцовыя бюджэты могуць зацвярджацца з перавышэннем расходаў над даходамі — дэфіцытам у межах агульнага размеру, які вызначаецца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь. Калі ў працэсе выканання бюджэту адбываецца перавышэнне гранічнага ўзроўню дэфіцыту, Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь і мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў уводзіцца механізм секвестру расходаў.

Секвестр заключаецца ў адпаведным зніжэнні расходаў штомесячна па ўсіх артыкулах бюджэту на працягу астатняга часу бягучага фінансавага года. Секвестру не падлягаюць артыкулы расходаў, склад якіх вызначаецца па рэспубліканскаму бюджэту Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь, па мясцовых бюджэтах — адпаведнымі Саветамі народных дэпутатаў.

3. Пакрыццё дэфіцыту бюджэту ажыццяўляецца за кошт выпуску дзяржаўных пазык Рэспублікі Беларусь і мясцовых пазык або выкарыстання крэдытных рэсурсаў Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.

Рашэнні аб выпуску дзяржаўных пазык Рэспублікі Беларусь прымаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, аб выпуску мясцовых пазык — мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў. Размяшчэнне пазык носіць добраахвотны характар.

4. Асігнаванні на пагашэнне ўстановам банка доўгу, які існуе ў адпаведным бюджэце на пачатак плануемага года па наступіўшых тэрмінах выплаты, уключаючы запазычанасць мінулых гадоў, уключаюцца ў бюджэт плануемага года. У бюджэце прадугледжваюцца асігнаванні на выплату банку працэнтаў па абслугоўванню дзяржаўнага доўгу, а таксама на пагашэнне пазык і выплату працэнтаў па іх.

5. Перавышэнне даходаў над расходамі бюджэту пры яго фарміраванні складае лішак даходаў бюджэту. Рашэнні аб выкарыстанні лішку сродкаў прымаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь і выканаўчымі камітэтамі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў з наступным іх зацвярджэннем адпаведна Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь і мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў.

Артыкул 15. Узаемаадносіны бюджэтаў з іншымі элементамі фінансавай сістэмы

1. Бюджэтная сістэма Рэспублікі Беларусь з'яўляецца часткай фінансавай сістэмы Рэспублікі Беларусь. Фінансавыя рэсурсы прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый, а таксама іншых юрыдычных асоб не з'яўляюцца часткай бюджэту і не могуць уключацца ў склад бюджэтаў органаў дзяржаўнай улады.

Усе размешчаныя на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь прадпрыемствы, аб'яднанні і арганізацыі, іншыя юрыдычныя асобы незалежна ад ведамаснай падпарадкаванасці і форм уласнасці, а таксама грамадзяне абавязаны ўносіць у бюджэт плацяжы, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Плацяжы ў бюджэт пералічваюцца ў першачарговым і бясспрэчным парадку ва ўстаноўленыя тэрміны.

Плацельшчыкі падаткаў, збораў і непадатковых плацяжоў нясуць устаноўленую заканадаўствам Рэспублікі Беларусь адказнасць за правільнасць вылічэння і своечасовасць выплаты плацяжоў у бюджэт і выкананне дзеючага заканадаўства.

2. Расходная частка бюджэтаў можа змяшчаць асігнаванні і датацыі прадпрыемствам або іншым юрыдычным асобам. Гэта не цягне за сабой устанаўлення правоў уласнасці дзяржавы або мясцовых Саветаў народных дэпутатаў на адпаведнае прадпрыемства або маёмасць іншых юрыдычных асоб.

3. Расходная частка бюджэтаў можа змяшчаць асігнаванні на інвестыцыі ў капітал ужо дзеючых або ўпершыню ствараемых прадпрыемстваў (акрамя прыватных). Вынікам такіх інвестыцый з'яўляецца ўласнасць дзяржавы або мясцовых Саветаў народных дэпутатаў на эквівалентную частку капіталу, якая знаходзіць сваё выражэнне ў поўным валоданні або ў валоданні акцыямі (паямі) акцыянернага таварыства.

Інвестыцыі за кошт бюджэтных асігнаванняў любога органа дзяржаўнай улады на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праводзяцца свабодна ў капітал прадпрыемстваў на агульных камерцыйных умовах, за выключэннем галін і прадпрыемстваў, спецыяльна вылучаных рашэннямі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

4. Даходы, якія атрымліваюцца ад выкарыстання дзяржаўнай маёмасці, створанай за кошт бюджэтных інвестыцый, могуць быць поўнасцю або часткова ўключаны ў даход бюджэту або непасрэдна накіраваны на патрэбы развіцця адпаведнага прадпрыемства.

РАЗДЗЕЛ ІІІ. АСНОВЫ БЮДЖЭТНАГА ПРАЦЭСУ

Артыкул 16. Арганізацыя бюджэтнага працэсу

1. Складанне і выкананне бюджэту забяспечваюць Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь і выканаўчыя камітэты мясцовых Саветаў народных дэпутатаў, разгляд і зацвярджэнне бюджэтаў праводзіцца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь і мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў.

2. Парадак складання, разгляду, зацвярджэння і выканання рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў вызначаецца гэтым Законам, іншымі заканадаўчымі актамі, рашэннямі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, а таксама мясцовых Саветаў народных дэпутатаў у межах правоў, якія вызначаюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

3. Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь і мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў разгляд і зацвярджэнне бюджэтаў і справаздач аб іх выкананні праводзяцца галосна і публічна, за выключэннем тых выпадкаў, калі разглядаюцца пытанні, аднесеныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь да катэгорыі дзяржаўных тайн.

4. Парадак касавага выканання рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў устанаўліваецца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь сумесна з Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь.

5. Для вызначэння фінансавай палітыкі ў адпаведнасці з задачамі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь выканаўчыя камітэты абласных і Мінскага гарадскога Саветаў народных дэпутатаў прадстаўляюць у Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь зводы зацверджаных бюджэтаў і справаздач аб іх выкананні.

Парадак і тэрміны складання і прадстаўлення выканаўчымі камітэтамі абласных і Мінскага гарадскога Саветаў народных дэпутатаў гэтых матэрыялаў устанаўліваюцца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь.

Парадак і тэрміны складання і прадстаўлення выканаўчымі камітэтамі Саветаў народных дэпутатаў зводаў, зацвярджэння мясцовых бюджэтаў і справаздач аб іх выкананні ўстанаўліваюцца фінансавымі органамі вышэйстаячага ўзроўню прымяняльна да парадку і тэрмінаў, устаноўленых Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь.

Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь складае зводную справаздачу аб выкананні бюджэту, якая ўключае справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту і мясцовых бюджэтаў абласцей і горада Мінска, і прадстаўляе яе Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь.

6. Формы бюджэтнай дакументацыі па рэспубліканскаму бюджэту і мясцовых бюджэтах вызначаюцца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 17. Складанне, разгляд, зацвярджэнне і выкананне бюджэтаў

1. Складанню праектаў бюджэтаў папярэднічае распрацоўка праграм і прагнозаў сацыяльна-эканамічнага развіцця тэрыторыі. На аснове прагнозных ацэнак паступлення плацяжоў у бюджэт, зыходзячы з дзеючага падатковага заканадаўства і іншых нарматыўных актаў, якія рэгулююць паступленне непадатковых даходаў, разлікаў па бюджэту на плануемы год, атрыманых ад міністэрстваў, ведамстваў, асацыяцый, саюзаў, канцэрнаў і іншых юрыдычных асоб, Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь і мясцовымі фінансавымі органамі вызначаюцца даходы і расходы бюджэту. Пры гэтым расходы бюджэту фарміруюцца з улікам прагназуемых даходаў.

Прагнозныя паказчыкі па даходах і расходах рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў на наступны год і прапановы па збалансаванню бюджэтаў прадстаўляюцца адпаведна Міністэрству фінансаў Рэспублікі Беларусь і фінансавымі органамі — выканаўчым камітэтам мясцовых Саветаў народных дэпутатаў.

(Заканчэнне на 5-й стар.)

 НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Закон Рэспублікі Беларусь

Аб бюджэтнай сістэме Рэспублікі Беларусь

(Заканчэнне. Пачатак на 4-й стар.)

Пасля вывучэння фінансавых і матэрыяльных магчымасцей Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь і выканаўчыя камітэты мясцовых Саветаў народных дэпутатаў прымаюць рашэнні аб бюджэтных даходах і расходах на планаемы год, у адпаведнасці з якімі ажыццяўляецца распрацоўка праектаў бюджэтаў па крыніцах даходаў і відах расходаў. Распрацаваныя праекты рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў уносяцца адпаведна на разгляд Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і выканаўчых камітэтаў Саветаў народных дэпутатаў.

2. Рэспубліканскі бюджэт, разгледжаны Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, і мясцовыя бюджэты, разгледжаныя выканаўчымі камітэтамі Саветаў народных дэпутатаў, прадстаўляюцца на зацвярджэнне адпаведна ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь і мясцовыя Саветы народных дэпутатаў.

Прымаемыя Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь і мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў рашэнні, якія прадугледжваюць павелічэнне расходаў або памяншэнне даходаў бюджэту, адначасова павінны змяшчаць прапановы аб кампенсацыі даходаў, што выпадаюць, з крыніц дадатковых расходаў.

3. Праект рэспубліканскага бюджэту на чарговы фінансавы (бюджэтны) год, разліковыя паказчыкі па даходах і расходах мясцовых бюджэтаў абласцей і горада Мінска і праекты нарматываў адлічэнняў у іх бюджэты ад агульнарэспубліканскіх падаткаў і падаткаў прадстаўляюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь з разлікамі і абгрунтаваннем Вярхоўнаму Савету Рэспублікі Беларусь не пазней 1 кастрычніка года, які папярэднічае чарговаму фінансаваму (бюджэтнаму) году.

Рэспубліканскі бюджэт і нарматывы адлічэнняў у мясцовыя бюджэты абласцей і горада Мінска ад агульнарэспубліканскіх падаткаў і даходаў зацвярджаюцца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь да наступлення чарговага фінансавага (бюджэтнага) года.

4. У выпадку незацвярджэння бюджэту да наступлення фінансавага (бюджэтнага) года Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь і выканаўчыя камітэты Саветаў народных дэпутатаў маюць права расходаваць сродкі ў размеры адной дванаццатай аб'ёму бюджэтных асігнаванняў папярэдняга года ў межах даходаў, якія паступаюць на рахунак кожнага месяца, да зацвярджэння адпаведнымі Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь і адпаведнымі Саветамі народных дэпутатаў.

5. Асігнаванні на выплату працэнтаў па дзяржаўнаму доўгу і на пагашэнне запазычанасці мінулых гадоў, якая існуе ў адпаведным бюджэце на дадзены год, прадугледжваюцца ў бюджэце планаемага фінансавага года ў поўным аб'ёме ў адпаведнасці з прынятымі раней абавязацельствамі па пазыках і крэдытах. Расходы дадзенага віду не могуць быць скарочаны або перанесены на іншы час без згоды трымальнікаў абавязацельстваў.

6. У складзе бюджэтаў ствараюцца рэзервовыя і мэтавыя бюджэтныя фонды, сродкі якіх выкарыстоўваюцца па мэтаваму прызначэнню на ажыццяўленне сацыяльных, эканамічных і іншых праграм, ліквідацыю вынікаў стыхійных бедстваў і правядзенне іншых мерапрыемстваў, якія не маглі быць прадугледжаны пры зацвярджэнні бюджэтаў. Сродкі гэтых фондаў могуць перадавацца бязвыплатна ў выглядзе субсідый, субвенцый і датацый у бюджэты ніжэйстаячага ўзроўню. Памеры гэтых фондаў вызначаюцца пры зацвярджэнні бюджэту.

7. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь па ўзгадненню з выканаўчымі камітэтамі абласных і Мінскага гарадскога Саветаў народных дэпутатаў устанаўлівае парадак выкарыстання рэзервовых фондаў. Парадак фінансавання расходаў, прадугледжаных па бюджэту, вызначаецца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь.

8. На працягу бюджэтнага перыяду могуць быць унесены змяненні ў даходную і расходную часткі бюджэту. Павелічэнне або памяншэнне аб'ёму даходаў і расходаў бюджэту праводзіцца на аснове пастаноў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, рашэнняў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў, а таксама рашэнняў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і выканаўчых камітэтаў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў у межах прадастаўленых ім правоў. Не дапускаецца прыняцце рашэнняў, якія выклікаюць утварэнне дэфіцыту бюджэту звыш устаноўленага размеру.

9. У выпадку выдання заканадаўчых актаў, прыняцця рашэнняў Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў і іх выканаўчымі камітэтамі, якія выклікаюць павелічэнне расходаў або памяншэнне даходаў ніжэйстаячых бюджэтаў, гэтым бюджэтам павінны кампенсавацца страты выдзеленых сродкаў. У выпадку прыняцця мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў і іх выканаўчымі камітэтамі рашэнняў, якія выклікаюць памяншэнне даходаў або павелічэнне расходаў вышэйстаячых бюджэтаў, гэтым бюджэтам пакрываюцца сродкі за кошт адпаведных мясцовых бюджэтаў.

Пры прыняцці Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь, Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў і іх выканаўчымі органамі рашэнняў, якія выклікаюць павелічэнне даходаў або памяншэнне расходаў ніжэйстаячых бюджэтаў, дадатковыя даходы, што ўтвараюцца ў сувязі з гэтым, або эканомія ў расходах падлягаюць перадачы ў вышэйстаячыя бюджэты.

10. У выпадках прыняцця мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў рашэнняў, якія супярэчаць законам Рэспублікі Беларусь і рашэнням вышэйстаячых Саветаў народных дэпутатаў у частцы размераў нарматываў адлічэнняў ад падаткаў і даходаў, а таксама ў частцы ўзаемных разлікаў, іх выкананне прыпыняецца выканаўчымі камітэтамі Саветаў народных дэпутатаў вышэйстаячага ўзроўню да ўзгаднення спрэчных пытанняў, а сродкі, што належаць адпаведным бюджэтам, спаганяюцца (перадаюцца) выканаўчымі органамі дзяржаўнай улады ў бясспрэчным (першачарговым) парадку.

11. Прадпрыемствы, аб'яднанні, гаспадарчыя арганізацыі і ўстановы выкарыстоўваюць выдзеленыя бюджэтныя асігнаванні па мэтаваму прызначэнню. Неабгрунтавана атрыманыя імі датацыі і кампенсацыі з бюджэту і выкарыстаныя бюджэтныя асігнаванні не па мэтаваму прызначэнню падлягаюць адкліканню ў бюджэт у бясспрэчным парадку.

Прадпрыемствы, аб'яднанні і гаспадарчыя арганізацыі (незалежна ад падпарадкаванасці і формы ўласнасці), неабгрунтавана атрымаўшыя датацыі і кампенсацыі з бюджэту, акрамя таго, выплачваюць у рэспубліканскі бюджэт штраф у трохразовым размеры залішне атрыманых сродкаў. У такім размеры спаганяецца штраф з прадпрыемстваў, аб'яднанняў і гаспадарчых арганізацый за выкарыстанне бюджэтных сродкаў не па мэтаваму прызначэнню. Спісанне ўказаных штрафаў праводзіцца ў бясспрэчным парадку па патрабаванню фінансавых органаў.

На кіраўнікоў і іншых службовых асоб прадпрыемстваў, аб'яднанняў, гаспадарчых арганізацый, бюджэтных устаноў, неабгрунтавана атрымаўшых датацыі і кампенсацыі з бюджэту, а таксама вінаватых у выкарыстанні бюджэтных сродкаў не па мэтаваму прызначэнню, пастановай кіраўніка фінансавага органа накладаецца адміністрацыйны штраф у размеры да трох службовых акладаў.

РАЗДЗЕЛ IV. РЭСПУБЛІКАНСКІ БЮДЖЭТ

Артыкул 18. Змест рэспубліканскага бюджэту

1. Рэспубліканскі бюджэт забяспечвае грашовымі сродкамі фінансаванне мерапрыемстваў, якія маюць агульнарэспубліканскае значэнне. Праз рэспубліканскі бюджэт ажыццяўляецца пераразмеркаванне часткі фінансавых рэсурсаў паміж абласцямі і горадам Мінскам у мэтах выраўноўвання ўзроўню іх эканамічнага і сацыяльнага развіцця.

2. За кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту могуць выдзяляцца мясцовым бюджэтам абласцей і горада Мінска субвенцыі, датацыі, субсідыі пры недастатковасці сродкаў іх бюджэтаў для фінансавання асобных расходаў і мерапрыемстваў.

Размеркаванне даходаў і расходаў паміж рэспубліканскім бюджэтам і мясцовымі бюджэтамі абласцей і горада Мінска вызначаецца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь па прадстаўленню Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб мясцовым самакіраванні і мясцовай гаспадарцы ў Рэспубліцы Беларусь", а таксама іншымі заканадаўчымі актамі.

Артыкул 19. Даходы рэспубліканскага бюджэту

У даходы рэспубліканскага бюджэту ўключаюцца:

рэгулюючыя агульнарэспубліканскія падаткі і даходы (падатак на дабаўленую вартасць, акцызы, у парадку, прадугледжаным законам, і іншыя падаткі і даходы), за выключэннем часткі сродкаў, якая размяркоўваецца ў мясцовыя бюджэты абласцей і горада Мінска ў парадку і размерах, якія ўстанаўліваюцца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь пры зацвярджэнні бюджэту;

падатак на прыбытак прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый, падатак на даходы, якія паступаюць у рэспубліканскі бюджэт, а таксама ў мясцовыя бюджэты абласцей і горада Мінска ў размерах, якія ўстанаўліваюцца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь;

падатак на экспарт і імпарт;

мытныя пошліны і зборы;

даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці;

сродкі, якія атрымліваюцца ад іншых дзяржаў у адпаведнасці з заключанымі пагадненнямі;

даходы ад апераацый з каштоўнымі паперамі, якія ажыццяўляюцца ад імя рэспублікі;

іншыя даходы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 20. Расходы рэспубліканскага бюджэту

У рэспубліканскі бюджэт уключаюцца расходы на:

фінансаванне капітальных укладанняў па аб'ектах, якія адносяцца да рэспубліканскай уласнасці, прыродаахоўных мерапрыемстваў, частку, што ажыццяўляецца ў адпаведнасці з агульнарэспубліканскімі праграмамі;

фінансаванне мерапрыемстваў па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС;

фінансаванне агульнарэспубліканскіх праграм па сацыяльнай абароне насельніцтва;

фінансаванне іншых агульнарэспубліканскіх мэтавых праграм;

фінансаванне затрат, звязаных са знешнеэканамічнай дзейнасцю;

фінансаванне ўстаноў і арганізацый народнай адукацыі, навукі, культуры, аховы здароўя, фізічнай культуры, сацыяльнага забеспячэння рэспубліканскага падпарадкавання;

фінансаванне затрат па закладцы і абнаўленню дзяржрэзерваў;

утрыманне рэспубліканскіх органаў дзяржаўнай улады і кіравання, судоў, праваахоўных органаў, органаў пракуратуры, дзяржаўнай бяспекі;

фінансаванне абароны, пагранічных войск і мытнай службы;

пагашэнне крэдытаў банка, выдадзеных для пакрыцця бюджэтных расходаў, дзяржаўнага доўгу, і выплату працэнтаў па іх;

утварэнне рэзервовага фонду Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, рэзерву Міністра фінансаў Рэспублікі Беларусь і іншых мэтавых фондаў і рэзерваў;

выдачу пазык, субвенцый, субсідый, датацый прадпрыемствам, арганізацыям, выканкамам абласных і Мінскага гарадскога Саветаў народных дэпутатаў;

іншыя мерапрыемствы, якія фінансуюцца з рэспубліканскага бюджэту ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 21. Складанне рэспубліканскага бюджэту

1. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь арганізуе работу па складанню праекта бюджэту ў тэрміны, якія ім вызначаюцца.

2. Складанне праекта рэспубліканскага бюджэту ажыццяўляецца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь.

3. У адпаведнасці з устаноўленымі Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь тэрмінамі распрацоўкі праекта бюджэту на планаемы год міністэрствы і ведамствы Рэспублікі Беларусь, асацыяцыі, канцэрны, саюзы, аб'яднанні, прадпрыемствы і арганізацыі, іншыя юрыдычныя асобы, размешчаныя на тэрыторыі рэспублікі, выканаўчыя камітэты абласных і Мінскага гарадскога Саветаў народных дэпутатаў прадстаўляюць у Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь па формах, якія ім паведамляюцца, неабходныя даныя аб прагнозных паказчыках даходаў і расходаў для распрацоўкі праекта бюджэту.

4. Пасля прапрацоўкі прагнозных ацэнак даходаў і расходаў бюджэту ў цэлым па рэспубліцы з міністэрствамі і ведамствамі, выканаўчымі камітэтамі абласных і Мінскага гарадскога Саветаў народных дэпутатаў Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь разлікова вызначае даходы і расходы бюджэту рэспублікі, распрацоўвае праект рэспубліканскага бюджэту і нарматывы адлічэнняў ад агульнарэспубліканскіх падаткаў і даходаў у мясцовыя бюджэты абласцей і горада Мінска.

5. Распрацаваны праект рэспубліканскага бюджэту ўносіцца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь. Адначасова прадстаўляюцца прапановы аб нарматывах адлічэнняў ад агульнарэспубліканскіх падаткаў і даходаў у мясцовыя бюджэты абласцей і горада Мінска, а таксама разліковыя паказчыкі па даходах і расходах рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў на планаемы год і чакаемае выкананне гэтых бюджэтаў за бягучы год.

Артыкул 22. Разгляд і зацвярджэнне рэспубліканскага бюджэту

1. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь разглядае праект рэспубліканскага бюджэту і нарматывы адлічэнняў ад агульнарэспубліканскіх падаткаў і даходаў у мясцовыя бюджэты абласцей і горада Мінска і прадстаўляе ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь:

праект рэспубліканскага бюджэту з выдзяленнем асноўных крыніц даходаў і асноўных відаў расходаў;

прапановы аб нарматывах адлічэнняў ад агульнарэспубліканскіх даходаў і падаткаў у мясцовыя бюджэты абласцей і горада Мінска і аб размеры абаротнай касавай наяўнасці па рэспубліканскаму бюджэту;

праект Закона аб Дзяржаўным бюджэце Рэспублікі Беларусь на чарговы год;

разліковыя (прагнозныя) паказчыкі па даходах і расходах бюджэту Рэспублікі Беларусь на чарговы год і тлумачальную запіску да іх.

2. Прадстаўлены Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь праект рэспубліканскага бюджэту і прапановы аб нарматывах адлічэнняў ад агульнарэспубліканскіх падаткаў і даходаў у мясцовыя бюджэты абласцей і горада Мінска папярэдне разглядаюцца пастаяннымі камісіямі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Па выніках разгляду пастаянныя камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь рыхтуюць і прадстаўляюць Вярхоўнаму Савету Рэспублікі Беларусь заключэнне і прапановы аб прыняцці праекта рэспубліканскага бюджэту або адхіленні з улікам наступных характарыстык:

верхняя мяжа аб'ёму асігнаванняў (расходная частка бюджэту) — усяго і па яго асноўных напрамках;

ніжняя мяжа паступленняў у бюджэт даходаў (даходная частка бюджэту) — у цэлым і па асобных даходных крыніцах;

межы незбалансаванасці рэспубліканскага бюджэту (дэфіцыт) або перавышэнне даходаў над расходамі.

3. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь па дакладу Савета Міністраў рэспублікі і садакладу адпаведнай пастаяннай камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь разглядае праект рэспубліканскага бюджэту і праекты нарматываў адлічэнняў ад агульнарэспубліканскіх падаткаў і даходаў у мясцовыя бюджэты абласцей і горада Мінска, а таксама заключэнне пастаянных камісій Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, прапановы народных дэпутатаў і пасля іх абмеркавання прымае рашэнне аб зацвярджэнні рэспубліканскага бюджэту і нарматываў адлічэнняў ад агульнарэспубліканскіх падаткаў і даходаў у мясцовыя бюджэты абласцей і горада Мінска ці адхіляе прапанаваны праект бюджэту і накіроўвае яго на дапрацоўку.

4. У Законе аб Дзяржаўным бюджэце адлюстроўваюцца:

агульны аб'ём даходаў і расходаў рэспубліканскага бюджэту;

размер асноўных крыніц даходаў па рэспубліканскаму бюджэту;

асігнаванні па рэспубліканскаму бюджэту на фінансаванне народнай гаспадаркі, сацыяльна-культурных мерапрыемстваў, навукі, органаў дзяржаўнай улады і кіравання, судоў, праваахоўных органаў, органаў пракуратуры, дзяржаўнай бяспекі, абароны, пагранічных войск, мытнай службы;

размер рэзервовага фонду Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, рэзерву міністра фінансаў Рэспублікі Беларусь і іншых мэтавых фондаў, якія ўтвараюцца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам;

размер сродкаў, якія накіроўваюцца на абслугоўванне і пагашэнне дзяржаўнага доўгу;

гранічны размер дэфіцыту па рэспубліканскаму бюджэту, мясцовых бюджэтах абласцей і горада Мінска;

размер іншых расходаў агульнарэспубліканскага характару;

размер абаротнай касавай наяўнасці;

нарматывы адлічэнняў ад агульнарэспубліканскіх падаткаў і даходаў у мясцовыя бюджэты абласцей і горада Мінска.

5. Закон аб Дзяржаўным бюджэце Рэспублікі Беларусь публікуецца для ўсеагульнага ведама.

6. У выпадку адхілення Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь праекта бюджэту пастаянныя камісіі ўносяць у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прапановы аб павелічэнні даходаў, скарачэнні расходаў або змяненні падатковага заканадаўства.

Артыкул 23. Выкананне рэспубліканскага бюджэту

1. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь арганізуе выкананне рэспубліканскага бюджэту. Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь і яго органы на месцах, дзяржаўныя падатковыя інспекцыі, міністэрствы, дзяржаўныя камітэты і ведамствы, асацыяцыі, канцэрны, саюзы, прадпрыемствы, аб'яднанні, арганізацыі і іншыя юрыдычныя асобы, выканаўчыя камітэты мясцовых Саветаў народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь забяспечваюць паступленне ўсіх прадугледжаных па бюджэту падаткаў і даходаў і эфектыўнае расходаванне бюджэтных сродкаў строга па мэтаваму прызначэнню.

2. Рэспубліканскі бюджэт выконваецца па роспісу даходаў і расходаў з паквартальным размеркаваннем, які складаецца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь.

3. Даходы, дадаткова атрыманыя пры выкананні рэспубліканскага бюджэту, а таксама сумы перавышэння даходаў над расходамі, якія ўтвараюцца на канец года ў выніку перавыканання даходаў або эканоміі ў расходах, накіроўваюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь на фінансаванне расходаў, якія ўзніклі ў працэсе выканання бюджэту.

4. Свабодныя сродкі рэспубліканскага бюджэту могуць укладвацца ў гаспадарчую дзейнасць, акцыі і іншыя каштоўныя паперы, выдачу пазык прадпрыемствам або іншым юрыдычным асобам у парадку, які ўстанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

5. У выпадку часовых касавых разрываў пры выкананні мясцовых бюджэтаў абласцей і горада Мінска з рэспубліканскага бюджэту Рэспублікі Беларусь па хадайніцтвах выканаўчых камітэтаў абласных і Мінскага гарадскога Саветаў народных дэпутатаў могуць быць выдадзены пазыкі, якія павінны быць пагашаны ва ўзгодненыя тэрміны ў межах бягучага года.

Артыкул 24. Кантроль за выкананнем рэспубліканскага бюджэту

1. Кантроль за выкананнем рэспубліканскага бюджэту ажыццяўляецца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь, Кантрольнай палатай Рэспублікі Беларусь і Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. Аператыўны кантроль за своечасовым паступленнем даходаў і эфектыўным расходаваннем сродкаў па мэтаваму прызначэнню ўскладаецца на Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь, фінансавыя органы і дзяржаўныя падатковыя інспекцыі.

2. На працягу года ход выканання рэспубліканскага бюджэту разглядаецца адпаведнай пастаяннай камісіяй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і Кантрольнай палатай Рэспублікі Беларусь. Вывады і прапановы па выкананню даходнай і расходнай частак бюджэту ў неабходных выпадках дакладваюцца на сесіях Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 25. Справаздача аб выкананні рэспубліканскага бюджэту

1. Справаздача аб выкананні рэспубліканскага бюджэту складаецца Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь і прадстаўляецца Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь .

2. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь штогод да 1 чэрвеня прадстаўляе ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь адобраную ім справаздачу аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за папярэдні фінансавы (бюджэтны) год.

3. Пастаянныя камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь папярэдне разглядаюць прадстаўленую Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь справаздачу аб выкананні рэспубліканскага бюджэту, складаюць заключэнне па справаздачы і прадстаўляюць яе Вярхоўнаму Савету Рэспублікі Беларусь.

4. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь па дакладу Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, заключэнню і садакладу адпаведнай пастаяннай камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь разглядае і зацвярджае справаздачу аб выкананні рэспубліканскага бюджэту адначасова з зацвярджэннем рэспубліканскага бюджэту на чарговы фінансавы (бюджэтны) год.

Справаздача аб выкананні рэспубліканскага бюджэту публікуецца ў аб'ёме паказчыкаў, прынятых пры зацвярджэнні бюджэту.

Артыкул 26. Надзвычайны бюджэт

1. На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь рашэннем Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь можа ўводзіцца надзвычайны бюджэт. Падставай для ўвядзення надзвычайнага бюджэту з'яўляецца ўвядзенне надзвычайнага становішча ў рэспубліцы. У выпадку павелічэння дэфіцыту бюджэту да размераў, якія не пакрываюцца крыніцамі даходаў, уводзіцца рэжым надзвычайнага расходавання сродкаў.

2. Надзвычайны бюджэт і рэжым надзвычайнага расходавання сродкаў уводзяцца ў адпаведнасці са спецыяльным законам Рэспублікі Беларусь.

РАЗДЗЕЛ V. МЯСЦОВЫЯ БЮДЖЭТЫ

Артыкул 27. Змест мясцовых бюджэтаў

Мясцовыя бюджэты — фінансавая база мясцовых Саветаў народных дэпутатаў. Да мясцовых бюджэтаў адносяцца абласныя, раённыя, гарадскія, раённыя ў гарадах, пасялковыя бюджэты і бюджэты сельсаветаў. З мясцовых бюджэтаў ажыццяўляецца фінансаванне эканамічных, сацыяльных, культурных і іншых праграм і мерапрыемстваў мясцовага і міжрэгіянальнага значэння, якія ажыццяўляюцца мясцовымі органамі дзяржаўнай улады.

Мясцовыя Саветы самастойна распрацоўваюць, зацвярджаюць і выконваюць бюджэты ў інтарэсах насельніцтва. Умяшанне любых органаў і арганізацый у працэс распрацоўкі, зацвярджэння і выканання мясцовых бюджэтаў не дапускаецца. Мясцовыя бюджэты ніжэйстаячых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак не ўключаюцца ў бюджэты вышэйстаячых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак.

Артыкул 28. Даходы мясцовых бюджэтаў

Даходы мясцовых бюджэтаў кожнага ўзроўню фарміруюцца ў адпаведнасці з падатковым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, Законам "Аб мясцовым самакіраванні і мясцовай гаспадарцы ў Рэспубліцы Беларусь" і артыкулам 9 гэтага Закона. У мясцовыя бюджэты могуць перадавацца сродкі ў выглядзе датацый, субсідый і субвенцый з вышэйстаячых бюджэтаў.

Артыкул 29. Размеркаванне даходаў па ўзроўнях мясцовых бюджэтаў

1. Даходы, якія залічваюцца ў мясцовыя бюджэты, размяркоўваюцца паміж абласнымі, раённымі, гарадскімі, раённымі ў гарадах, пасялковымі бюджэтамі і бюджэтамі сельсаветаў у залежнасці ад тэрытарыяльнага ўзроўню мясцовых Саветаў у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб мясцовым самакіраванні і мясцовай гаспадарцы ў Рэспубліцы Беларусь" і іншымі заканадаўчымі актамі.

2. Склад і размеры часткі агульнарэспубліканскіх падаткаў і даходаў, якія залічваюцца ў мясцовыя бюджэты абласцей і горада Мінска, вызначаюцца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь у Законе аб Дзяржаўным бюджэце рэспублікі на наступны год.

3. Размежаванне часткі агульнарэспубліканскіх і іншых падаткаў, даходаў і збораў паміж абласнымі, Мінскім гарадскім бюджэтамі і мясцовымі бюджэтамі раёнаў і гарадоў абласнога падпарадкавання вызначаецца абласнымі, Мінскім гарадскім Саветамі народных дэпутатаў.

4. Размежаванне часткі агульнарэспубліканскіх і іншых падаткаў, даходаў і збораў паміж гарадскімі, раённымі ў гарадах, бюджэтамі гарадоў раённага падпарадкавання, пасялковымі бюджэтамі і бюджэтамі сельсаветаў вызначаецца гарадскімі (гарадоў абласнога падпарадкавання), раённымі Саветамі народных дэпутатаў.

Артыкул 30. Расходы мясцовых бюджэтаў

1. Мясцовыя Саветы народных дэпутатаў самастойна вызначаюць напрамак выкарыстання сродкаў мясцовых бюджэтаў, за выключэннем перададзеных ім з бюджэту вышэйстаячага ўзроўню фінансавых рэсурсаў, якія маюць мэтавае прызначэнне.

2. У складзе мясцовых бюджэтаў утвараюцца рэзервовыя, мэтавыя і іншыя фонды, размеры якіх вызначаюцца адпаведнымі мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў.

3. Мясцовыя Саветы народных дэпутатаў могуць укладваць свабодныя сродкі, якія ў іх ёсць, у гаспадарчую дзейнасць, акцыі і іншыя каштоўныя паперы, выдаваць пазыкі прадпрыемствам або іншым юрыдычным асобам.

Артыкул 31. Размежаванне расходаў паміж мясцовымі бюджэтамі

Размежаванне расходаў паміж мясцовымі бюджэтамі ажыццяўляецца вышэйстаячымі мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў зыходзячы з падпарадкаванасці, тэрытарыяльнага размяшчэння прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў, значнасці фінансуемых мерапрыемстваў.

Артыкул 32. Складанне мясцовых бюджэтаў

1. Кожны мясцовы Савет народных дэпутатаў самастойна фарміруе свой бюджэт, базіруючыся на:

замацаваных крыніцах даходаў;

устаноўленых Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь і мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў для адпаведных бюджэтаў нарматывах адлічэнняў ад агульнарэспубліканскіх і іншых падаткаў і даходаў;

дадатковых крыніцах, якія адшукваюцца мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў;

патрэбнасці ў расходах на фінансаванне мерапрыемстваў па эканамічнаму і сацыяльнаму развіццю адпаведнай тэрыторыі.

2. Парадак і тэрміны распрацоўкі мясцовых бюджэтаў устанаўліваюцца адпаведнымі выканкамамі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў. Складанне мясцовых бюджэтаў праводзіцца фінансавымі органамі (бюджэтаў гарадоў раённага падпарадкавання, пасялковых бюджэтаў і бюджэтаў сельсаветаў — выканкамамі адпаведных Саветаў народных дэпутатаў). Распрацаваныя праекты мясцовых бюджэтаў уносяцца фінансавымі органамі выканаўчым камітэтам адпаведных Саветаў народных дэпутатаў. Адначасова прадстаўляюцца прапановы аб нарматывах адлічэнняў ад агульнарэспубліканскіх і іншых падаткаў і даходаў у ніжэйстаячыя мясцовыя бюджэты.

Артыкул 33. Разгляд і зацвярджэнне мясцовых бюджэтаў

1. Выканаўчыя камітэты мясцовых Саветаў народных дэпутатаў разглядаюць праекты мясцовых бюджэтаў (абласнога, раённага, гарадскога, раённага ў горадзе, пасялковага бюджэту і бюджэту сельсавета) і нарматывы адлічэнняў ад агульнарэспубліканскіх і іншых падаткаў і даходаў у ніжэйстаячыя мясцовыя бюджэты і прадстаўляюць адпаведным Саветам народных дэпутатаў:

праект бюджэту адпаведнага Савета народных дэпутатаў з выдзяленнем асноўных крыніц даходаў і асноўных відаў расходаў;

прапановы аб нарматывах адлічэнняў ад агульнарэспубліканскіх і іншых падаткаў і даходаў у ніжэйстаячыя мясцовыя бюджэты і аб размеры абаротнай касавай наяўнасці па бюджэту, прадстаўленаму на разгляд;

праект рашэння Савета народных дэпутатаў аб бюджэце на чарговы год;

разліковыя (прагнозныя) паказчыкі па даходах і расходах у цэлым па дадзенай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы.

2. Прадстаўленыя Саветам народных дэпутатаў праекты мясцовых бюджэтаў і прапановы аб нарматывах адлічэнняў ад агульнарэспубліканскіх і іншых падаткаў і даходаў у ніжэйстаячыя мясцовыя бюджэты папярэдне разглядаюцца пастаяннымі камісіямі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў.

Па выніках разгляду пастаянныя камісіі рыхтуюць і прадстаўляюць Саветам народных дэпутатаў заключэнне і прапановы аб прыняцці праекта адпаведнага мясцовага бюджэту або адхіленні з улікам наступных характарыстык:

верхняя мяжа аб'ёму асігнаванняў (расходная частка мясцовага бюджэту) — усяго і па яго асноўных напрамках;

ніжняя мяжа паступленняў у бюджэт (даходная частка мясцовага бюджэту) — у цэлым і па асобных крыніцах;

мяжа незбалансаванасці мясцовага бюджэту — дэфіцыт або перавышэнне даходаў.

3. Савет народных дэпутатаў па дакладу выканкама разглядае праект бюджэту і нарматывы адлічэнняў ад агульнарэспубліканскіх і іншых падаткаў і даходаў у ніжэйстаячыя бюджэты, а таксама заключэнне і садаклад пастаянных камісій і прымае рашэнне аб зацвярджэнні бюджэту ці адхіляе прапанаваны варыянт бюджэту і накіроўвае яго на дапрацоўку.

4. Зацверджаны мясцовы бюджэт носіць абавязковы характар для выканання выканаўчым камітэтам Савета народных дэпутатаў, прадпрыемствамі, аб'яднаннямі і арганізацыямі ўсіх форм уласнасці і ўстановамі, размешчанымі на тэрыторыі Савета. У ім адлюстроўваюцца:

агульны аб'ём даходаў і расходаў, у тым ліку па асноўных крыніцах і напрамках;

перавышэнне даходаў над расходамі або расходаў над даходамі — дэфіцыт бюджэту;

размеры рэзервовых, мэтавых і іншых фондаў, а таксама абаротнай касавай наяўнасці;

нарматывы адлічэнняў ад агульнарэспубліканскіх і іншых падаткаў і даходаў у ніжэйстаячыя бюджэты;

размер дэфіцыту па бюджэтах ніжэйстаячага ўзроўню ў межах узроўню, зацверджанага вышэйстаячым Саветам.

Артыкул 34. Выкананне мясцовых бюджэтаў

1. Выканаўчыя камітэты мясцовых Саветаў народных дэпутатаў, мясцовыя фінансавыя органы, дзяржаўныя падатковыя інспекцыі па абласцях, гарадах і раёнах арганізуюць выкананне бюджэтаў, забяспечваюць паступленне ўсіх прадугледжаных даходаў, эканомнае расходаванне бюджэтных сродкаў у адпаведнасці з іх мэтавым прызначэннем.

2. Мясцовыя бюджэты выконваюцца ў адпаведнасці з роспісам даходаў і расходаў з паквартальным размеркаваннем, які складаецца фінансавымі ўпраўленнямі (аддзеламі) выканаўчых камітэтаў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў, а там, дзе адсутнічаюць фінансавыя ўпраўленні (аддзелы), — адпаведнымі выканаўчымі камітэтамі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў у адпаведнасці з зацверджаным бюджэтам.

3. У працэсе выканання бюджэту выканаўчыя камітэты Саветаў народных дэпутатаў могуць уносіць змяненні па даходах і расходах бюджэту ў межах прадастаўленых ім правоў.

4. Даходы, дадаткова атрыманыя пры выкананні мясцовых бюджэтаў, а таксама сумы перавышэння даходаў над расходамі, якія ўтвараюцца ў выніку перавыканання даходаў або эканоміі ў расходах, поўнасцю застаюцца ў распараджэнні Саветаў народных дэпутатаў, адабранню не падлягаюць і выкарыстоўваюцца па іх меркаванню.

5. У выпадку часовых касавых разрываў пры выкананні мясцовых бюджэтаў па хадайніцтвах выканаўчых камітэтаў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў могуць быць выдадзены пазыкі:

з абласных бюджэтаў — выканаўчым камітэтам гарадскіх і раённых Саветаў народных дэпутатаў;

з гарадскіх бюджэтаў (гарадоў, якія маюць раённае дзяленне) — выканаўчым камітэтам раённых (у гарадах) Саветаў народных дэпутатаў;

з раённых бюджэтаў — выканаўчым камітэтам гарадоў раённага падпарадкавання, пасялковых і сельскіх Саветаў народных дэпутатаў.

Вяртанне атрыманых пазык праводзіцца ў межах бягучага года.

6. Кантроль за выкананнем мясцовых бюджэтаў ажыццяўляецца адпаведнымі Саветамі народных дэпутатаў праз выканаўчыя камітэты і Кантрольнай палатай Рэспублікі Беларусь. Аператыўны кантроль за своечасовым паступленнем даходаў і эфектыўным расходаваннем сродкаў па мэтаваму прызначэнню праводзіцца фінансавымі органамі і дзяржаўнымі падатковымі інспекцыямі.

Артыкул 35. Справаздача аб выкананні мясцовых бюджэтаў

1. Справаздача аб выкананні абласнога, Мінскага гарадскога, раённага, гарадскога (горада абласнога падпарадкавання) бюджэту складаецца фінансавым упраўленнем (аддзелам) выканаўчага камітэта адпаведнага Савета народных дэпутатаў. Справаздача аб выкананні бюджэту горада раённага падпарадкавання, пасялковага бюджэту і бюджэту сельсавета складаецца выканаўчым камітэтам адпаведнага Савета народных дэпутатаў.

2. Пастаянныя камісіі абласнога, Мінскага гарадскога, раённага, гарадскога (гарадоў абласнога і раённага падпарадкавання), пасялковага і сельскага Саветаў народных дэпутатаў разглядаюць справаздачу аб выкананні бюджэту, складаюць заключэнне і прадстаўляюць яго адпаведнаму Савету народных дэпутатаў.

3. Справаздача аб выкананні мясцовага бюджэту зацвярджаецца адпаведным Саветам народных дэпутатаў і публікуецца ў друку для ўсеагульнага ведама.

РАЗДЗЕЛ VI. ПАЗАБЮДЖЭТНЫЯ ФОНДЫ

Артыкул 36. Пазабюджэтныя фонды

1. Пазабюджэтныя фонды ўяўляюць сабой сукупнасць фінансавых рэсурсаў, якія выкарыстоўваюцца па мэтаваму прызначэнню, і незалежны ад бюджэтаў. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь і мясцовыя Саветы народных дэпутатаў усіх узроўняў маюць права ствараць пазабюджэтныя фонды, вызначаць крыніцы іх утварэння і парадак выкарыстання.

Крыніцы ўтварэння пазабюджэтных фондаў вызначаюцца заканадаўствам.

Падаткі і іншыя плацяжы, прызначаныя для залічэння ў бюджэт, не падлягаюць накіраванню ў пазабюджэтныя фонды. Бюджэтныя сродкі не павінны пералічвацца ў пазабюджэтныя фонды.

2. Фарміраванне і выкарыстанне сродкаў пазабюджэтнага мэтавага фонду ажыццяўляецца згодна са статусам (палажэннем), які зацвярджаецца адпаведна Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь або мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў. Статус (палажэнне) кожнага мэтавага фонду ўключае характарыстыку крыніц даходаў і напрамак іх выкарыстання, а таксама парадак кіравання фондам.

3. Па рашэнню Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь могуць ствараца пазабюджэтныя мэтавыя фонды сумесна з мясцовымі органамі ўлады.

Мясцовыя Саветы народных дэпутатаў могуць ствараць пазабюджэтныя фонды сумесна з вышэйстаячымі і ніжэйстаячымі органамі ўлады.

4. Галоўныя распарадчыкі сродкаў пазабюджэтных фондаў прадстаўляюць адпаведна Міністэрству фінансаў Рэспублікі Беларусь і мясцовым фінансавым органам справаздачы аб выкананні даходаў і расходаў гэтых фондаў ва ўстаноўленыя тэрміны.

5. Кантроль за выкарыстаннем сродкаў пазабюджэтных фондаў і пазабюджэтных сродкаў ажыццяўляецца Кантрольнай палатай Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь, мясцовымі фінансавымі органамі і дзяржаўнымі падатковымі інспекцыямі.

6. Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь і мясцовыя фінансавыя органы сістэматычна інфармуюць адпаведна Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь і выканаўчыя камітэты мясцовых Саветаў народных дэпутатаў, а ў неабходных выпадках — Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь і Саветы народных дэпутатаў аб выніках выканання даходаў і расходаў пазабюджэтных фондаў і пазабюджэтных сродкаў.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С.ШУШКЕВІЧ.

4 чэрвеня 1993 г.
г.Мінск.

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь "Аб бюджэтнай сістэме Рэспублікі Беларусь"

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Увесці ў дзеянне Закон Рэспублікі Беларусь "Аб бюджэтнай сістэме Рэспублікі Беларусь" з дня яго апублікавання.

2. Устанавіць, што да прывядзення заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб бюджэтнай сістэме Рэспублікі Беларусь" дзеючыя заканадаўчыя акты прымяняюцца ў той частцы, у якой яны не супярэчаць указанаму Закону.

3. Прызнаць страціўшым сілу з дня ўвядзення ў дзеянне ўказанага Закона Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 1961 года "Аб бюджэтных правах Рэспублікі Беларусь і мясцовых Саветаў народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь" (ЗЗ БССР, 1961 г., N 19, арт. 184; 1969 г., N 25, арт. 372; 1972 г., N 29, арт. 444; 1985 г., N 34, арт. 482; 1988 г., N 12, арт. 192).

4. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь да 1 кастрычніка 1993 года:

унесці ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прапановы аб прывядзенні заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб бюджэтнай сістэме Рэспублікі Беларусь";

прывесці ў адпаведнасць з указаным Законам рашэнні, прынятыя Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;

забяспечыць перагляд і адмену міністэрствамі, дзяржаўнымі камітэтамі і ведамствамі Рэспублікі Беларусь іх нарматыўных актаў, якія супярэчаць указанаму Закону.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
С.ШУШКЕВІЧ.

4 чэрвеня 1993 г.
г.Мінск. N 2348-XII

тел. (0172) 29-34-05, тел/факс (0172) 27-33-96, тел. (0172) 29-34-05, тел/факс (0172) 27-33-96

РЕКЛАМА РЕКЛАМА

тел. (0172) 29-34-05, тел/факс (0172) 27-33-96, тел. (0172) 29-34-05, тел/факс (0172) 27-33-96

Внимание деловых людей!
Союз предпринимателей Республики Беларусь, Гильдия брокеров Республики Беларусь
С 28 ИЮНЯ ПО 1 ИЮЛЯ
проводят деловую встречу
белорусских руководителей предприятий и организаций всех форм собственности с представителями 50 чешских и словацких фирм.
Подробная информация о составе и интересах чешских и словацких участников по тел. в Минске: 27-11-09, 23-13-65, факс 27-15-96.

Организация продает и сдает на комиссию
- соки, напитки импортные,
- шоколад (Хеллас—Финляндия),
- сигареты "ТУ-134."

Тел. в Минске: 54-01-11, 54-08-14. Факс 54-01-11.

Фирма-импортер продает оптом со склада в Минске
КРЕМ-КРАСКУ ДЛЯ ВОЛОС "ИМПРЕССИЯ" (Болгария).
Тел. (0172) 39-40-07.

Шелл знает Европу.

Европа знает Шелл.

Shell

Оптовая продажа высококачественных автомобильных масел "Шелл" за рубли в Минске. СП "SEGO P+S": (0172) 26-98-56, 26-91-32.

"ООО"СиР"
строит коттеджи на собственных участках: Раубичи, Слобода, Боровляны, Петровичи и др.
Тел. в Минске: 62-81-28, 62-89-73.

Фирма "АСАН"
прямые оптовые и мелкооптовые поставки со склада в г.Минске
фломастеров "CENTROPEN" (Чехия).
Форма оплаты — любая.
Тел.: (0172) 20-48-23, 20-89-79.

А/О "Торговый дом Санкт-Петербург и К"
